Сямейная газета



**Пра бэбі-тэатр – са стваральнікамі**



**Што аддаюць дарма ў сацсетках**



**Якога гадаванца выбраць?**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід ЦУПРЫК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце:**

*«У моладзі, якая працуе ў органах кіравання, адна асаблівасць — яны выдатныя тэарэтыкі з выдатнай адукацыяй, але часта ім не хапае прафесійнага вопыту. Важна, каб яны прайшлі кар'ерную дарогу, пару гадоў папрацавалі на прадпрыемстве, у сацыяльнай сферы. Пасля гэтага можна даверыць пасаду, дзе трэба прымаць больш адказныя рашэнні».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8694 | ▼ |
| Еўра | 2,0409 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0331 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0703 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17079>

Родная газета на родней мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 КРАСАВІКА 2017 г. ЧАЦВЕР № 79 (28443)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# РАЗАМ ПА ШЛЯХУ АДРАДЖЭННЯ

**Аляксандр Лукашэнка і Пётр Парашэнка сустрэліся ў гадавіну чарнобыльскай катастрофы**

**Беларусь і Украіну звязваюць не толькі традыцыйныя эканамічныя, гандлёвыя адносіны. Дзяржавы звязаны — відаць, навек — агульнай бядой. Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі здарылася 31 год таму, але на ліквідацыю яе наступстваў патрэбны стагоддзі... Учора кіраўнікі абедзвюх дзяржаў наведалі сумна вядомы ва ўсім свеце Чарнобыль, а потым прыбылі на беларускую тэрыторыю — у вёску Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці.**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.



# Маці Героя

**Беразіно, што на Міншчыне, знаходзіцца за трыста кіламетраў ад небяспечнай зоны, але тут памятаюць і ўшаноўваюць ахвяр трагедыі і герояў, якія тушылі полымя на даху разбуранага 4-га энергаблока ЧАЭС. На тое ёсць свае прычыны. Па-першае, яшчэ да сумна вядомых падзей Беразіно стала пабрацімам украінскага Чарнобыля. А па-другое, у горадзе жывуць перасяленцы з небяспечнай зоны. У Беразіне знайшла прытулак сям'я героя-ліквідатара Васіля Ігнаценкі, які загінуў на атамнай станцыі ў першыя гадзіны пасля аварыі. Адну з новых вуліц горада назвалі яго імем.**

**Нягледзячы на працяглы дождж, на вуліцы Васіля Ігнаценкі, каля мемарыяльнай дошкі ў гонар героя, сабраліся вучні адной са школ горада, прадстаўнікі мясцовай вертыкалі і асабовы склад дзяжурнай змены МНС Беразіна, перасяленцы. На ўрачыстасць запрасілі і маці адважнага ліквідатара Таццяну Ігнаценку. Таццяна Пятроўна вельмі хвалявалася, расказваючы прысутным пра свайго Васіля. Было відаць, што час зусім не залячыў незагойную рану, якую прынесла жанчыне чарнобыльская бяда.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Прыёмная кампанія — 2017

# ЧАМУ ЦТ ЛЕПШ НЕ ПРАПУСКАЦЬ?

**Важныя нюансы, пра якія трэба ведаць абітурыентам**

**«Прыёмная кампанія ў вышэйшых навучальных установах пройдзе сёлета па новых правілах прыёму. Пашырэнне магчымасцяў для абітурыентаў стане асноўнай яе адметнасцю», — пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі ў БЕЛТА першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.**

Адно з важных нованўвядзенняў — магчымасць здачы цэнтралізаванага тэсціравання па **чатырох вучэбных прадметах замест трох.** Да таго ж сертыфікаты ЦТ будуць дзейнічаць цяпер два гады. Істотным плюсам можна лічыць і з'яўленне **трох рэзервовых дзён** для здачы ЦТ. Раней быў прадугледжаны ўсяго адзін такі дзень, і калі абітурыент захварэў і прапусціў, напрыклад, два ЦТ, ён быў вымушаны траціць цэлы год.

— Разам з тым пашырэнне кола дысцыплін на ЦТ накладае на абітурыентаў і сур'ёзную адказнасць. Да выбару прадметаў трэба падыходзіць надзвычай прадумана яшчэ на этапе рэгістрацыі на ЦТ, — папярэджвае **начальнік упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.** — Магчымасць здачы чацвёртай дысцыпліны павялічвае, на жаль, і рызыку дапусціць памылку. У першую чаргу наяўнасць чацвёртага сертыфіката актуальная для тых спецыяльнасцяў, якія знаходзяцца на стыку галін ці прадметных абласцей.

Калі абітурыент дакладна вызначыўся з профілем будучай спецыяльнасці і яму не патрабуецца «падстраховачны» трэці профільны прадмет, ён можа здаваць на ЦТ і рускую, і беларускую мову. І гэта таксама можна разглядаць як пашырэнне магчымасцяў. Але прыёмныя камісіі ўсё роўна будуць прымаць у абітурыентаў толькі тры сертыфікаты. Гэта значыць, што абітурыенту можна будзе арыентавацца на больш высокім балам, бо не сакрэт, што лёс абітурыента нярэдка вырашаюць усяго адзін-два лішнія балы. А вось зарэгістравацца на ЦТ больш чым на чатыры дысцыпліны не атрымаецца, паколькі рэгістрацыя адбываецца ў аўтаматычным рэжыме, і на пятае ЦТ праграма проста «адмовіцца» абітурыента рэгістраваць.

СТАР. 5

# РАЗАМ ПА ШЛЯХУ АДРАДЖЭННЯ

## Каб людзі жылі бяспечна

Тут Аляксандр Лукашэнка і Пётр Парашэнка наведалі Свята-Міхайлаўскую царкву, дзе запалілі свечкі ў памяць ахвяр чарнобыльскай трагедыі і выступілі перад жыхарамі вёскі.

— Сёння для нашых народаў вельмі цяжкі, але памятны дзень, дзень з вялікім сэнсам, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — Мы з Пятром Аляксеевічам пабывалі на чарнобыльскай станцыі, паглядзелі на тую грандыёзную работу, якая была здзейснена ўкраінскай дзяржавай разам з партнёрамі. Яны зрабілі ўсё для таго, каб мінімізаваць страшныя наступствы чарнобыльскай катастрофы. Мы глядзелі гэта збудаванне, пабывалі ў чарнобыльскіх рэгіёнах, абляцелі тыя землі, якія пацярпелі, паглядзелі на тыя вёсачкі, тыя дамкі, якія яшчэ засталіся ў гэтых, ужо таежных, можна сказаць, лясах чарнобыльскай зоны... Мы турбуемся, як аднавіць жыццё ў гэтых раёнах, каб людзі маглі жыць бяспечна, так, як жывуць вось тут, у гэтым цудоўным месцы.

Беларускі лідар расказаў, што яго ўкраінскі калега ўважліва глядзеў з верталёта на Ляскавічы. Вёска сапраўды выглядае вельмі прывабна — з якога боку ні паглядзі. Дарогі, па якіх сюды дабіраліся журналісты, па якасці мала чым адрозніваюцца ад магістраляў рэспубліканскага значэння. У вёсцы, якая мае статус аграгарадка, дагледжаныя дамы, ёсць школа і дзіцячы садок, для гасцей — атэль... А тут ім — асабліва турыстам — сапраўды ёсць на што паглядзець. Нездарма Прыпяцкае Палессе лічыцца адным з самых маляўнічых куткоў свету.

— Я не паспеў яму (Пятру Парашэнку. — **Заўв. аўт.**) сказаць, што першы раз, калі я сюды прыехаў, — гэта былі пяскі, бездарожжа, але самае страшнае было тое, што людзі ў мяне папрасілі хлеба, — прыгадаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Не хапала хлеба ў той час. Я даручыў вайскоўцам, каб яны неадкладна перакінулі палешукам кухні ваенныя, якія былі, якія выпякаюць хлеб. І калі я прыехаў праз два гады на палескую зямлю, людзі мне дзякавалі за тое, што кожны дзень могуць ужо пакаштаваць свежы хлеб. Сёння, безумоўна, жыццё іншае. Не без складанасцяў. Як палешукі кажуць, жыць трэба, мы з Пятром Аляксеевічам будзем абмяркоўваць.

Па словах Пятра Парашэнкі, украінскі і беларускі народы цалкам унікальныя. Ён падкрэсліў: нам як зрэнку вока трэба берагчы гэты мір і гэтае сяброўства. 31 год таму планету пасцігла самая страшная тэхнагенная катастрофа за ўсю гісторыю чалавецтва. Украінскі Прэзідэнт упэўнены, што менавіта ўкраінцы і беларусы з дапамогай партнёраў па ўсім свеце не толькі абаранілі дзяржавы ад не вельмі мірнага атама, але і дазволілі нам праз 31 год прадэманстраваць рашучыя крокі па адраджэнні Палесся.

Як адзначыў Прэзідэнт Украіны, для таго каб народам жылося лягчэй, ужо прадпрымаюцца важныя крокі. Двухбаковы тавараабарот за два месяцы бягучага года вырас на 40%. Украінцы набываюць беларускія харчовыя тавары, а таксама трактары, аўтамабілі, нафтапрадукты. Беларусы набываюць прадукцыю сельскай гаспадаркі, кармавую, хімічнай прамысловасці, чорнай металургіі. Пётр Парашэнка нагадаў, што, калі ў беларуска-ўкраінскім тавараабароце быў спад, прэзідэнты дамовіліся, што зробяць усё, што ад іх залежыць, каб узаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі развівалася. Ён таксама паведаміў, што і паездкі з адной краіны ў другую будуць палегчаны. На яго думку, мяжа павінна быць сімвалам сяброўства і міру, таварыскасці і партнёрскіх адносін паміж нашымі краінамі.

Пазней падчас перагавораў з украінскім калегам у рэзідэнцыі «Ляскавічы» беларускі лідар заявіў: абедзве дзяржавы змогуць справіцца з існуючымі праблемамі дзеля дабрабыту сваіх народаў. Аляксандр Лукашэнка аргументаваў гэта ўжо згаданымі вышэй поспехамі ў галіне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. У той жа час ёсць і пытанні, якія неабходна вырашыць:

— Спецыялісты і члены ўрадаў з намі. Мы гатовыя, абмеркаваўшы з вамі, прыняць пэўныя рашэнні. Хачу запэўніць: усе рашэнні, якія мы сёння з вамі прымем, будуць няўхільна выконвацца з беларускага боку.

Пётр Парашэнка канстатаваў, што на беларускіх землях, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС, устаноўлены высокія сацыяльныя стандарты.

* * *

Па выніках перагавораў з Пятром Парашэнкам Прэзідэнт Беларусі заявіў журналістам, што разам з пытаннямі пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў цэнтры ўвагі кіраўнікоў дзвюх краін было і эканамічнае супрацоўніцтва:

— Доўгія гады Украіна захоўвае за сабой статус аднаго з асноўных рынкаў збыту для беларускіх прадпрыемстваў, а Беларусь з'яўляецца рынкам збыту для ўкраінскіх тавараў. Мы, безумоўна, яшчэ далёка ад ранейшых паказчыкаў, але ў 2016 годзе ўзаемны гандлёвы абарот вырас больш чым на 12% і склаў 4 мільярды долараў.

Сёння Беларусь — чацвёрты па значнасці партнёр Украіны. Па словах Прэзідэнта Беларусі, цяпер у суседняй дзяржаве працуюць — і паспяхова — зборачныя прадпрыемствы Мінскага трактарнага і аўтамабільнага заводаў, акцыянерных таварыстваў «Гомсельмаш», «Магілёўліфтмаш», здзяйсняецца сумесны выпуск камунальнай і пажарнай тэхнікі.

— Мы дамовіліся па-новаму паглядзець на вытворчую кааперацыю, актывізаваць працу па стварэнні новых сумесных вытворчасцяў у самых розных галінах эканомікі, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Забароненых тэм для нашых дзяржаў няма. Прыярытэтным павінна стаць узаемадзеянне ў прамысловасці, нафтахімічным комплексе, аграрнай і транспартна-лагістычнай сферах. Беларусь гатова павялічыць пастаўкі ва Украіну аўтамабільнай і сельскагаспадарчай тэхнікі, угнаенняў і будматэрыялаў. У сваю чаргу, мы зацікаўлены ў закупках вырабаў з металу, прадукцыі раслінаводства і жывёлаводства.

Падчас перагавораў абмяркоўваліся і канкрэтныя праекты двухбаковага партнёрства. Урадам абедзвюх краін даручана максімальна эфектыўна выкарыстоўваць той інструментарый, які ўжо ёсць, для падтрымкі сувязяў паміж прадпрыемствамі Беларусі і Украіны, актывізаваць міжгаліновае супрацоўніцтва.

У гутарцы прэзідэнтаў, безумоўна, была закранута і сітуацыя на ўсходзе Украіны. Беларускі бок і надалей будзе рабіць усё неабходнае для ўрэгулявання канфлікту, каб брацкія народы жылі ў міры і згодзе. Беларускі лідар прызнаўся: яму не сорамна глядзець у вочы ні ўкраінцам, ні Прэзідэнту Украіны.

— У найбліжэйшы час пры садзейнічанні Міжнароднага таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца Беларусь плануе накіраваць гуманітарную дапамогу насельніцтву Украіны, якое пражывае па абодва бакі ад лініі размежавання, — паведаміў Аляксандр Лукашэнка. — Падтрымаем самым неабходным, у чым маюць патрэбу людзі, — прадуктамі і сродкамі гігіены. Мы будзем працаваць у кантакце, каб знайсці самы кароткі шлях для таго, каб гуманітарная дапамога даходзіла да людзей і па адзін, і па другі бок барыкад.

Пётр Парашэнка, у сваю чаргу, запрасіў беларускага лідара здзейсніць афіцыйны візіт ва Украіну гэтым летам. Украінскі Прэзідэнт заявіў, што цяпер абодвум бакам трэба распрацаваць парадак дня і падрыхтаваць неабходныя дакументы, падпісанне якіх пашырыць супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Украінай.

**Надзея ЮШКЕВІЧ,**
*yushkevich@zviazda.by*

*Петрыкаўскі раён.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# НАПРАМКІ РАБОТЫ ВЫЗНАЧАНЫ АДРАЗУ

**Выконваць абавязкі першага віцэ-прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта будзе Андрэй Асташэвіч**

**Такое рашэнне прынята на рабочай нарадзе, якую правялі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА і Андрэй АСТАШЭВІЧ з членамі выканкама і кіраўнікамі структурных падраздзяленняў НАК Беларусі.**

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні і задачы, якія стаяць перад Нацыянальным алімпійскім камітэтам на найбліжэйшую перспектыву. Галоўныя з іх — падрыхтоўка да Алімпійскіх гульняў 2018 і 2020 гадоў і арганізацыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. Таксама Андрэй Асташэвіч, які прыступіў да выканання абавязкаў, адзначыў, што задача НАК — гэта не толькі прадстаўленне Беларусі на міжнароднай арэне, але і вялікая работа ўнутры краіны.

— У ліку прыярытэтных напрамкаў — заахвочванне развіцця і прапаганды спорту і фізічнай культуры ў Беларусі, што з'яўляюцца асноўным залогам павышэння колькасці людзей, якія займаюцца спортам. Адзін з інструментаў гэтага механізма — федэрацыі, у якіх неабходна выбудаваць сістэму падрыхтоўкі, пачынаючы ад масавага набору і заканчваючы кропкавай канцэнтрацыяй рэсурсаў як фізічных, так і матэрыяльных для заваявання медалёў і папулярызацыі відаў спорту на міжнароднай арэне. Нам трэба будзе сістэматызаваць усю работу. У ліку прыярытэтных задач — выбудоўванне дакладнага ўзаемадзеяння з федэрацыямі, развіццё зімовых і летніх відаў спорту, дзе асаблівую ўвагу варта звярнуць на гульнявыя віды за кошт іх масавасці.

Таксама Андрэй Асташэвіч падкрэсліў, што неабходна найбольш эфектыўна выкарыстоўваць пабудаваныя спартыўныя базы, удзяляючы ўвагу шырокаму ўключэнню дзяцей для заняткаў у секцыях на месцах для папулярызацыі тых відаў спорту, якія культывуюцца ў рэгіёнах і маюць вялікія традыцыі.

— Чым большая будзе масавасць, тым яснейі лепш стане праводзіцца адбор, тым больш высокіх вынікаў мы дамажамся ў будучыні на міжнароднай арэне, — дадаў ён.

Адзначым, што раней Андрэй Асташэвіч займаў пасаду дырэктара РЦАП «Раўбічы».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## Парламенцкі дзённік

# Прырасці ў разы. Грашова

**Тавараабарот Беларусі і Эстоніі можа павялічыцца**

**Такое меркаванне выказаў Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, падчас сустрэчы з Валерыем Корбам, кіраўніком групы дружбы Парламента Эстонскай Рэспублікі з Парламентам Беларусі.**

«У апошнія гады мы досыць стабільна працуем у гандлёва-эканамічным плане, — адзначыў віцэ-спікер. — Але планку, што мелі раней, на жаль, зараз моцна апусцілі. Тыя 100 мільёнаў долараў тавараабароту, якія маем цяпер, на мой погляд, не наша пазіцыя. Мы маглі б мець значна больш, як мінімум у разы».

Парламентарый прапанаваў заняцца гэтай тэмай больш падрабязна і сумесна адшукаць узаемныя кропкі росту. Адным з варыянтаў выйсця дэпутат назваў развіццё адносін паміж ведамствамі. «Калі будзе інтарэс, мы гатовы арганізаваць адпаведныя профільныя сустрэчы на ўзроўні міністэрстваў», — дадаў ён. На думку Баляслава Пірштука, беларускі бок можа быць цікавы эстонскаму ў энергетычнай сферы, аграпрамысловым комплексе, лёгкай і харчовай прамысловасцях, інфармацыйнай і інавацыйнай сферах, IT-тэхналогіях. Ёсць напрацоўкі і ў сферы інвестыцый, але, на думку віцэ-спікера, яны пакуль слаба прадстаўлены.

Другі блок, па якім плануецца развіваць узаемадзеянне, — сумесная праца ў міжнародных арганізацыях. Беларускі парламентарый нагадаў, што ў гэтым годзе Мінск будзе прымаць летнюю сесію Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (ПА АБСЕ). «Мы б хацелі больш актыўна ўдзельнічаць і атрымаць статус назіральніка Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора. Ваша пазіцыя ў гэтым пытанні можа быць досыць важкай», — адзначыў дэпутат.

Па словах Валерыя Корба, члена камісіі Дзяржаўнага сходу Эстонскай Рэспублікі і кіраўніка групы сяброўства, візіт эстонскай дэлегацыі носіць вітальны характар: парламентарыі прыехалі ў Беларусь, каб пазнаёміцца з прадстаўнікамі новага склікання Палаты прадстаўнікоў, што займаюцца супрацоўніцтвам з іх краінай. Для Эстоніі наладжванне кантактаў з нашай дзяржавай мае вялікае значэнне, бо ў гэтай прыбалтыйскай краіне пражывае шмат нашых суайчыннікаў, якія з'ехалі туды ў 1940—1950-х гадах.

Як падкрэсліў Віктар Мiраш, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па аграрнай палітыцы, кіраўнік працоўнай групы ніжняй палаты беларускага парламента па супрацоўніцтве з парламентам Эстоніі, беларуская дыяспара ў гэтай краіне стаіць на трэцім месцы па велічыні пасля расійскай і ўкраінскай. Гэта яшчэ адна значная нагода развіваць больш шчыльна ўсебаковае супрацоўніцтва з эстонскім бокам.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Кітай запусціў новы авіяносец

Гэта другі авіяносец у краіне пасля «Ляаніна», але першы, створаны КНР.



Карабель быў выведзены з сухога дока і спушчаны на ваду ў порце Далянь на паўночным усходзе краіны. Такім чынам Паднябесная павялічыла сваю ваенную прысутнасць у рэгіёне. Аб'ява аб спуску на ваду ўласнага авіяносца была зроблена ў той час, як ЗША і Паўночная Карэя абменьваюцца ўсё больш рэзкімі заявамі. Кітай раней заклікаў улады абедзвюх краін да спакою.

### Еўрапал выявіў 10 тысяч тон падробленай ежы

Еўрапейская паліцыя шосты раз правяла сумесна з Інтэрпалам аперацыю OPSON, падчас якой было канфіскавана амаль 10 тысяч тон падробных і няякасных прадуктаў і напояў на суму прыкладна ў 230 мільёнаў еўра. Гаворка ідзе аб падробленых кансервах, морапрадуктах, віне, алкагольным віскі, мінеральнай вадзе і многім іншым. Сёлета аперацыя OPSON была праведзена ў 61 краіне, сярод іх 21 уваходзіць у Еўрасаюз.

### Бразільскія індзейцы абстралялі паліцыю з лука



Некалькі індзейскіх плямёнаў Бразіліі зладзілі акцыю пратэсту ў сталіцы краіны, выступаючы супраць законапраекта аб дэмаркацыі зямель, — з-за яго карэнныя народы могуць пазбавіцца часткі сваіх спрадвечных тэрыторый. Праваднікі плямёнаў абвінавачваюць прэзідэнта Мішэля Тэмера ў тым, што ён збіраецца перадаць участкі зямлі ў Амазоніі буйным карпарацыям. Для разгону дэманстрантаў паліцыя ўжыла светлашумавыя гранаты, гумавыя кулі і пярцовы спрэй. Індзейцы ў адказ выпусцілі з вартавых парадку некалькі стрэл з лука.

### Google зменіць свой пошукавы алгарытм

Гэта будзе зроблена для таго, каб выключаць з вынікаў пошуку спасылкі на фэйкавыя навіны і экстрэмісцкія выказванні, паведаміла кампанія ў сваім блогу. «Нашы алгарытмы заўсёды спрабавалі «падмануць» людзі або сістэмы, каб іх сайты аказаліся як мага вышэй у выніках пошуку, — яны выкарыстоўвалі «фермы» нізкаякаснага кантэнту, схаваны тэкст і іншыя нядобрасумленныя прыёмы», — гаворыцца ў заяве кампаніі.

■ Надвор'е

# НА НОГІ — БОТЫ, У РУКІ — ПАРАСОНЫ



**У наступныя чатыры дні сіноптыкі прагназуюць моцныя дажджы, а ў пятніцу і суботу ўдзень магчымы нават град**

**Апошні тыдзень красавіка запомніцца нам дажджлівым і кантрастным па тэмпературы надвор'ем, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

У гэтыя дні ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць малаварухомыя атмасферныя франты, якія ідуць да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы. Яны падзеляць краіну на дзве зоны, калі халадней будзе па паўночным захадзе і істотна цяплей па паўднёвым усходзе Беларусі.

Увага! Сёння спецыялістамі нават аб'яўлены аранжавы ўзровень па прычыне моцных дажджоў. І ў пятніцу амаль паўсюдна па тэрыторыі Беларусі таксама пройдуць дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымы навальніцы, моцныя дажджы, а таксама град. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, удзень — 4—11 цяпла; па паўднёвым усходзе ўначы будзе плюс 8—11, удзень — ад плюс 12 да плюс 17 градусаў, а па Гомельскай вобласці — да 18—22 цяпла. У суботу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць толькі кароткачасовыя дажджы, але ў асобных раёнах прагназуюцца навальніцы, моцныя дажджы, а ўдзень ізноў магчымы град. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 цяпла, па паўднёвым усходзе да плюс 12 градусаў. Удзень будзе 9—16 цяпла, а па ўсходзе — ад плюс 17 да плюс 23 градусаў.

А цяпер добрая навіна. У нядзелю атмасферныя франты будуць павольна сыходзіць на ўсход, і надвор'е пачне паляпшацца. Прагназуецца, што ўначы ў цэнтральных і ўсходніх раёнах, а ўдзень пераважна па ўсходній частцы Беларусі чакаюцца толькі кароткачасовыя дажджы, аднак у асобных раёнах — навальніцы, моцныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, па ўсходзе — плюс 9—12, удзень чакаецца ад плюс 9 да плюс 16 градусаў, па паўднёвым усходзе — 17—20 цяпла.

### Істотных падтапленняў не чакаецца

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» гідролагі Белгідрамета, у апошнія дні на большасці рэк краіны адбываецца спад узроўняў вады з сутачнай інтэнсіўнасцю 1—8 сантыметраў. Так, на Дняпры каля г. Рэчыца, Прыпяці каля г. Нароўля і яе прытоку рацэ Сцвіга ў в. Кароцічы вада ўвайшла ў рэчышча. Вада знаходзіцца на пойме на прытоку Нёмана рацэ Шчара ў г. Слонім, прытоку Заходняга Буга рацэ Нараў у в. Нямерка, Дняпры каля г. Жлобін, Прыпяці каля в. Чэрнічы і г. Мазыр, яе прытоках рэках Стыр у в. Лапаціна, Случ каля в. Ленін, Пціч каля в. Першая Слабодка.

Спецыялісты паведамляюць, што ў найбліжэйшыя дні ў выніку выпадзення ападкаў на рэках будуць адзначацца невялікія ваганні ўзроўня вады. А вось нейкай дадатковай паводкі ў сувязі з гэтым яны не прагназуюць.

**Сяргей КУРКАЧ.** kurkach@zviazda.by

# ДЛЯ ЎСТОЙЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ

**На пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС тэрыторыях Магілёўшчыны ствараюцца ўмовы для паўнавартаснага жыцця.**

Жалобныя мітынгі, прысвечаныя Дню памяці чарнобыльскай трагедыі, прайшлі ў Магілёўскай вобласці. Ад гэтай бяды тут пацярпелі 14 раёнаў. Але жыццё працягваецца. Сімвалічна, што менавіта 26 красавіка ў Касцюковічах быў цалкам уведзены ў дзеянне Фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Крыху раней такі ж аб'ект запрацаваў на поўную моц у Краснаполлі.

— Мы перажылі аварыйна-аднаўленчы і рэабілітацыйны перыяды, зараз перайшлі да перыяду ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця, — паведаміў **начальнік аддзела па праблемах ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС і надзвычайных сітуацыях аблвыканкама Сяргей ЛАЗАРЭВІЧ.** — Сёння ствараюцца ўмовы для вядзення сельскай гаспадаркі, будуюцца фермы, птушнікі. Летась была распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя для будаўніцтва буйнога свінагадоўчага комплексу на 24 тысячы галоў у Слаўгарадскім раёне. Сёлета прыступаем да мантажна-будаўнічых работ. Частка фінансавання будзе ажыццяўляцца і за кошт «чарнобыльскіх» сродкаў. Наогул аб'ект ацэньваецца ў суму не меншую за 30 мільёнаў дэнамінаваных рублёў. Працягваем укладваць грошы ў стварэнне камфортных умоў для жыхароў пацярпелых ад аварыі населеных пунктаў. Сёлета плануецца газіфікаваць вёскі Нераж і Холстава ў Быхаўскім раёне. Будуць будавацца аб'екты водазабеспячэння ў Слаўгарадскім раёне. А ў самім Слаўгарадзе па чарнобыльскай праграме будзе закладзены 32-кватэрны жылы дом.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

# КВЕТКІ АД ЛІЦЭІСТАЎ І ВЕРНІКАЎ

**У гомельскім храме Архістратыга Міхаіла ў Дзень памяці чарнобыльскай трагедыі адслужылі паніхіду па загінулых у выніку тэхнагеннай катастрофы. Гісторыя царквы вартая ўвагі. Яна апынулася якраз у той зоне, адкуль людзей прымусова адсялілі.**



Дарэчы, на Гомельшчыне пасля выбуху смяротна небяспечнымі для жыхароў сталі 158 населеных пунктаў. У адным з іх — вёсцы Вылева Добрушскага раёна — і засталася старажытная царква, дзе на 14 гадоў прыпыніліся службы. Протаіерэй Андрэй Бялянка ў пачатку 2000-х актыўна садзейнічаў таму, каб храм пачаў новае жыццё, — ужо на чыстай тэрыторыі ў абласным цэнтры. Урэшце драўляны храм быў перанесены ў Гомель на Рэчыцкі праспект і роўна 11 гадоў таму асвечаны мітрапалітам Філарэтам.

Храм стаў помнікам ахвярам Чарнобыля. Каля ўвахода ў царкву пабудаваны мемарыял, на якім выбіты імёны пажарных-ратавальнікаў, якія першымі прыбылі на тушэнне пажару, і назвы загінулых вёсак. У дзень памяці да яго ляглі кветкі ад вернікаў храма, ліцэістаў МНС і кадэтаў гарадскога вучылішча.

Мітынгі-рэквіемы, прымеркаваныя да Дня памяці чарнобыльскай трагедыі, адбыліся ў Гомелі, Брагіне, Хойніках, Нароўлі і іншых населеных пунктах Гомельскай вобласці. Таксама прайшлі шматлікія спартыўныя мерапрыемствы: маладзёжны велафэст «Атамная міля», XII Міжнародны лёгкаатлетычны прабег «Брагінская дзесятка», лёгкаатлетычны забег «Званы Чарнобыля» пад эгідай Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by

■ Інавацыі для наватараў

# ЯК «ВЫГАДАВАЦЬ» ДОКТАРА НАВУК?

**Адна з найбольш значных праблем у навуковай сферы заключаецца ў малой колькасці дактароў навук ва ўзросце да 45 гадоў, лічыць старшыня Навуковага савета Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў (БРФФД) Сяргей ГАПОНЕНКА. Яна звязана, апроч іншага, з тым, што ў 1990-я гады шмат маладых вучоных, якія цяпер былі б у гэтым узросце, з'ехала за мяжу або змяніла сферу дзейнасці. Тым не менш намаганні для ліквідацыі гэтай праблемы прыкладаюцца, у тым ліку пры дапамозе грантаў, якія заахвочваюць свежыя кадры заставацца ў навуковай сферы.**

— Галоўныя аспекты, над якімі нам трэба цяпер працаваць, — гэта ўменне прадаваць вынікі сваіх распрацовак і ліквідацыя разрыву паміж лабараторыямі і прадпрыемствамі, — адзначае Сяргей Гапоненка. — Акрамя таго, эканоміка Беларусі характарызуецца адносна невялікай навуковай ёмістасцю (сумай сродкаў, накіраваных на новыя даследаванні і распрацоўкі). Калі ў развітых краінах гэты паказчык дасягае прыкладна трох працэнтаў ВУП, то ў нас яна меншая за адзін працэнт. Праўда, у той жа Германіі толькі адзін працэнт фінансуецца з бюджэту, усё астатняе ўкладваюць вялікія карпарацыі.

Якраз для рашэння гэтых і шэрагу іншых задач сёлета будзе рэалізавана некалькі новых праектаў. Адзін з іх — першая школа маладога навукоўца пад назвай «Малады вучоны пад ключ». Падчас яе правядзення ўдзельнікаў навучаць шукаць фінансаванне для сваіх праектаў, публікавацца ў навуковых выданнях з высокім індэксам цытавання, прэзентаваць вынікі сваёй працы, супрацоўнічаць з замежнымі калегамі і многаму іншаму.

— Акрамя гэтага, у нас ёсць некалькі ідэй на перспектыву, — расказаў **намеснік старшыні Савета маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей ТРУХАНАЎ.** — Напрыклад, варта падняць пытанне аб стварэнні наднацыянальнага органа па прынцыпе Рамачных праграм ЕС у межах ЕАЭС, дзе змаглі б удзельнічаць маладыя навукоўцы не з дзвюх, а адразу з трох краін. Ужо сёлета ў кастрычніку мы правядзём традыцыйную канферэнцыю «Моладзь у навуцы» ў новым фармаце, які мы назвалі «2.0.17». Вядома, змяніцца не толькі форма, але і змест, перш за ўсё мы б хацелі больш шырока заявіць пра распрацоўкі нашых маладых навукоўцаў, запрасіць удзельнікаў не толькі з краін СНД, але і з Заходняй Еўропы, а таксама дальняга замежжа.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** lyskavets@zviazda.by

■ Свая рыба

# «УРАДЖАЙ» ЛАСАСЁВЫХ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ Ў ЧАТЫРЫ РАЗЫ

**Паводле інфармацыі Белстата, летась у натуральных і штучных вадаёмах краіны было вылаўлена 19 тысяч тон рыбы, што на 4,8% больш, чым у 2015 годзе. Прамысловы ўлоў рыбы склаў 11,3 тысячы тон (108,1%), аматарскі — 7,7 тысячы тон (100,5%).**

Спецыялісты адзначаюць, што рыбагаспадарчымі арганізацыямі ў штучных вадаёмах вылаўлена 10,6 тысячы тон (94,3% ад агульнага аб'ёму прамысловага ўлову рыбы), у натуральных — 0,6 тысячы тон (5,7%). Найбольшую ўдзельную вагу ў агульным аб'ёме ўлову рыбы ў штучных вадаёмах займае карп — 74,3%. За мінулы год улоў гэтай рыбы ў параўнанні з папярэднім перыядам павялічыўся на 22,2% і склаў 7888,4 тоны. Мацней за ўсё летась павялічыўся аб'ём вырошчвання каштоўнай рыбы. Ласасёвых відаў рыб было вылаўлена 338,6 тоны, што ў 4,3 разы больш, чым у 2015 годзе. А яшчэ гаспадаркі атрымалі 314 тон амура (на 22,2% больш) і 94,4 тоны асятровых (плюс 18%).

**Сяргей КУРКАЧ.** kurkach@zviazda.by

■ Ведай нашых!

# РЭЙСЫ Ў ТЭРМІН — ВЕТЛІВАСЦЬ ДА ПАСАЖЫРАЎ

**«Белавія» і Нацыянальны аэрапорт Мінск увайшлі ў топ самых пунктуальных авіякампаній і аэрапортаў свету.**

Даследчая кампанія OAG з Вялікабрытаніі вызначыла самыя пунктуальныя авіякампаніі і аэрапорты свету за перыяд з кастрычніка 2016 года па сакавік 2017 года. ААТ «Авіякампанія «Белавія» і РУП «Нацыянальны аэрапорт «Мінск» апынуліся ў рэйтынгу на 8 месцы з 4 і 5 зоркамі адпаведна. «Белавія» выканала ў тэрмін 88,8 працэнта рэйсаў, а Нацыянальны аэрапорт «Мінск» — 90,6 працэнта, паведамілі ў прэс-службе авіякампаніі. Авіякампаніі і аэрапорты, пунктуальнасць якіх знаходзіцца ў дыяпазоне 90—100 працэнтаў, атрымліваюць у рэйтынгу 5 зорак, 87,5—89,9 працэнта — 4 зоркі, 83—87,4 працэнта — 3 зоркі, 80—82,9 працэнта — 2 зоркі і 75—79,9 працэнта — 1 зорку. Не пададзеныя ў рэйтынгу авіякампаніі маюць пунктуальнасць ніжэйшую за 75 працэнтаў. Рэйтынг публікуецца двойчы на год — у красавіку і кастрычніку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

# У Магілёве пахла канцэрагенамі

***Жахлівыя чорныя клубы дыму ў раёне былога рэгенератарнага завода можна было ўбачыць у аўторак з розных канцоў горада, а жыхарам вуліцы Чалюскінцаў і іншых, блізкіх да ачага ўзгарання, прыйшлося яшчэ і дыхаць атручаным паветрам.***

Паведамленне аб пажары ў цэнтр аператыўнага кіравання Магілёўскага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях паступіла 25 красавіка каля сямі гадзін вечара. Як потым высветлілася, гарэла звалка адходаў гумы на вуліцы Чалюскінцаў у абласным цэнтры. Пажар распаўсюдзіўся на плошчу каля 1000 квадратных метраў. Полымем былі ахоплены штабелі гуматэхнічных вырабаў вышынёй ад 1 да 2,5 м. Пажар быў ліквідаваны каля 10 гадзін вечара. Па словах **афіцыйнага прадстаўніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Уладзіміра УРУБЛЕЎСКАГА,** на яго ліквідацыі працавала 14 баявых разлікаў, 50 чалавек асабістага складу, выкарыстоўваўся пажарны цягнік Беларускай чыгункі. Як мяркуецца, прычынай узгарання стала неасцярожнае абыходжанне з агнём, вінаватыя асобы ўстанаўліваюцца.



Дарэчы, гэта не першы выпадак пажару на дадзенай пляцоўцы. Падобныя ўжо былі ў красавіку 2015 года і ў снежні 2008-га. Па некаторых звестках, гаспадара на тэрыторыі захоўвання гуматэхнічных матэрыялаў зараз няма. Але нават не трэба пытацца ў спецыялістаў, каб сказаць, наколькі гэта небяспечны аб'ект. Аўтамабільныя шыны і іншыя гуматэхнічныя вырабы ўяўляюць сабой злучэнні поліараматычных вуглевадародаў і канцэрагенных рэчываў, якія валодаюць высокім узроўнем таксічнасці. Падчас гарэння пакрышак вылучаецца курадым і сярністая кіслата. Ігнараванне праблем утылізацыі высокатаксічных адходаў і стварэння рэсурсазберагальных тэхналогій з часам пацягне за сабой масу непапраўных экалагічных наступстваў.

Па словах **начальніка гарадской інспекцыі прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Пятра ЛАПО,** інспекцыя ўжо неадноічы звярталася ў гарвыканкам з прапановай ліквідаваць гэтую небяспечную пляцоўку. На погляд Пятра Лапо, у горадзе ёсць прадпрыемствы, якія маглі б адразу перапрацоўваць гэты матэрыял. Але пакуль рашэнне наконт гэтага так і не было прынятае. Начальнік інспекцыі намераны чарговы раз звярнуць увагу на праблему і настойваць на яе вырашэнні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ
### Открытого акционерного общества «Белремстройсвязь»
(УНП 100347020)
**220049, г. Минск, переулок Чайковского, 3**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2016 года** *(тыс. руб.)*

| Активы | Код строки | На 31.12.2016 | На 31.12.2015 |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 5922 | 5801 |
| Нематериальные активы | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | - |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **5922** | **5801** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 1575 | 1081 |
| В том числе: материалы | 211 | 1507 | 1059 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | |
| незавершенное производство | 213 | | |
| готовая продукция и товары | 214 | 68 | 22 |
| товары отгруженные | 215 | | |
| прочие запасы | 216 | | |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | | |
| Расходы будущих периодов | 230 | 196 | 114 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | | |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 4422 | 2397 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 292 | 48 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 8 | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **6493** | **3640** |
| **БАЛАНС** | **300** | **12415** | **9441** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31.12.2016 | На 31.12.2015 |
|---|---|---|---|
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 3971 | 3971 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 16 | 16 |
| Добавочный капитал | 450 | 2128 | 2140 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 719 | 692 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | |
| Целевое финансирование | 480 | - | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **6834** | **6819** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | - | |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 441 | 362 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 5140 | 2260 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 4132 | 1585 |
| по авансам полученным | 632 | 347 | 60 |
| по налогам и сборам | 633 | 254 | 137 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 106 | 126 |
| по оплате труда | 635 | 278 | 330 |
| по лизинговым платежам | 636 | | |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 1 | 1 |
| прочим кредиторам | 638 | 22 | 21 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | | |
| Доходы будущих периодов | 650 | | |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | | |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **5581** | **2622** |
| **БАЛАНС** | **700** | **12415** | **9441** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2016 года** *(тыс. руб.)*

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 г. | За январь – декабрь 2015 г. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 20892 | 16140 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 18647 | 13837 |
| Валовая прибыль (010–020) | 030 | 2245 | 2303 |
| Управленческие расходы | 040 | 1865 | 2102 |
| Расходы на реализацию | 050 | 0 | |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030–040–050) | 060 | 380 | 201 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 1599 | 4897 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | 1725 | 5043 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070–080) | 090 | 254 | 55 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 9 | 49 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 6 | 5 |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | 0 | 0 |
| проценты к получению | 103 | 3 | 44 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 0 | 0 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 3 | 0 |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | 3 | 0 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | 0 | 0 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 14 | 50 |
| В том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 14 | 50 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 0 | 0 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 156 | 82 |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | 143 | 61 |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | 13 | 21 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | 0 | 0 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100–110+120–130) | 140 | -136 | 17 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 118 | 72 |
| Налог на прибыль | 160 | 57 | 35 |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | 0 | 0 |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | 0 | 0 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | 0 | 0 |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | 0 | 1 |
| Чистая прибыль (убыток) (±150–160±170±180–190–200) | 210 | 61 | 36 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 0 | 0 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | 0 | 0 |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 61 | 36 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | 0,12 | 0,08 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | 0,12 | 0,08 |

Информация об Обществе и его деятельности по состоянию на 01.01.2017 (форма №1)
4. Доля государства в уставном фонде – всего 64,47%, в том числе республиканская собственность – 256021 акция (64,47%).
5. Количество акционеров: всего 2040, в том числе юридических лиц – 10, из них нерезидентов РБ – 0, физических лиц – 2030, из них нерезидентов РБ – 1.
6. Информация о дивидендах и акциях:

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 48,57 | 32,08 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 32,17 | 94,34 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,12 | 0,08 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,08 | 0,24 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | руб. | 17,21 | 17,17 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

7. Отдельные финансовые результаты деятельности( тыс. руб.):

| Показатель | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 20892 | 16140 |
| Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | 20512 | 15939 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения, всего | 118 | 72 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 380 | 201 |
| в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | -126 | -146 |
| в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | -136 | 17 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 57 | 36 |
| Чистая прибыль (убыток) | 61 | 36 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 719 | 692 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства | 0 | 0 |

8. Среднесписочная численность работающих (человек) – 568.
9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: строительно-монтажные работы.
10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный 2016 год, – 30 марта 2017 года.
13. Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: не применяются.

**Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности за период с 01.01.2016 по 31.12 2016 г.**

Аудиторская организация: Общество с ограниченной ответственностью «Белросаудит», адрес: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7, свидетельство о гос. регистрации №600506719 от 28.04.2000 №465, УНП 600506719. Генеральный директор: Прокопьева А.Н. Аудитор, проводивший аудит: Драчинская Н.И.
Аудиторское мнение: отчетность ОАО «Белремстройсвязь» достоверно во всех существенных аспектах отражает его финансовое положение, финансовые результаты его деятельности и изменения его финансового положения (движение денежных средств) в соответствии с применимой основой составления и представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Руководитель И.Н. Курак
Зам. гл. бухгалтера Т.Г. Кузичева

ЕВРОТОРГ ИНВЕСТБАНК

## ОАО «Евроторгинвестбанк»
www.etib.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2017 г.
ОАО «Евроторгинвестбанк»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2017 г. | На 01.04.2016 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 5 029 | 5 242 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 545 | 1 780 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 14 616 | 14 073 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 19 922 | 3 909 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 52 513 | 57 854 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 2 948 | 2 112 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 416 | 491 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **96 989** | **85 461** |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 4 179 | 10 484 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 27 531 | 17 672 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 10 637 | 7 032 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 1 027 | 1 368 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **43 374** | **36 556** |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 43 000 | 43 000 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 8 504 | 2 477 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 193 | 201 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 1 918 | 3 227 |
| **30** | **ВСЕГО капитал** | **121** | | **53 615** | **48 905** |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **96 989** | **85 461** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2017 г.
ОАО «Евроторгинвестбанк»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 01.04.2017 г. | На 01.04.2016 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 4 384 | 5 600 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 619 | 1 014 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 3 765 | 4 586 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 403 | 469 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 31 | 92 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 372 | 377 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (5) | 110 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 798 | 1 193 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (40) | 61 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 738 | 980 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 240 | 534 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 3 126 | 2 880 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 92 | 79 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 1 174 | 2 922 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 315 | 747 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | **859** | **2 175** |

Председатель Правления В.А. Драгун

Главный бухгалтер С.С. Ящук

Дата подписания 17 апреля 2017 г.

Лицензия ОАО «Евроторгинвестбанк» № 26 от 28.05.2013 г. УНП 807000043.

**Утерянное свидетельство о государственной регистрации общества с ограниченной ответственностью «Робибел» (УНП 191305531) считать недействительным**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

| Наименование объекта | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| **Целевое назначение** | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | |
| **Местонахождение объекта** | г. Малорита, ул. Спортивная, 57 | г. Малорита, пер. Комсомольский, 8 |
| **Продавец объекта** | Малоритский районный исполнительный комитет | |
| **Организатор торгов** | Малоритский районный исполнительный комитет | |
| **Начальная цена продажи, руб.** | 8100,00 | 8165,00 |
| **Сумма задатка, руб.** | 810,00 | 816,50 |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер** | 0,1407 га Решение Малоритского райисполкома от 10.04.2017 №№462, 463 Кад. №125250100001003032 | 0,1418 га Решение Малоритского райисполкома от 10.04.2017 №№462, 463 Кад. №125250100001002905 |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | - | |
| **Вещное право, срок аренды земельного участка** | Частная собственность | |
| **Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, руб.** | 186,15 | 133,64 |

| Условия продажи | |
|---|---|
Навошта патрэбны чахлы? Адна з сур'ёзных праблем дзяцей, якія нарадзіліся заўчасна, — недаразвітая сятчатка. Вочы немаўляці хваравіта рэагуюць на любое святло, можа ўзнікнуць рэцінапатыя неданошаных. Таму ў агульнасусветнай практыцы празрыстыя боксы-кювезы накрываюць чахламі, каб рэгуляваць колькасць святла. Акрамя таго, зацямненне часткова ўзнаўляе ўмовы, у якіх немаўля знаходзіцца ва ўлонні маці. Яшчэ адна важная дэталь: накідкі з сінтэпонавым напаўняльнікам дазваляюць пазбегнуць лішніх цеплаўстрат.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***

■ Аддам дарма

# БЫЛО НАША — СТАЛА ВАША

## Як непатрэбныя рэчы атрымліваюць другое жыццё

**Увесну асабліва востра адчуваеш жаданне навесці вакол сябе парадак. Прыбраць у шафу ўсё ваўнянае і калючае, што нагадвала б пра зіму і халады, і назаўсёды расстацца з тымі рэчамі, якія толькі захламляюць дом. А што далей? Проста аднесці іх на сметнік? Але вось гэтая сукенка, амаль новая, магла б яшчэ доўга радаваць новую гаспадыню. Было б толькі каму аддаць...**
**Менавіта для таго, каб непатрэбныя камусьці рэчы маглі знайсці сабе новых гаспадароў, і былі створаны адмысловыя суполкі ў сацыяльных сетках. Для адных гэта магчымасць пазбавіцца ад непатрэбнага, для іншых жа — прыкметная эканомія сродкаў.**


**Аляксандра ГРАМЫКА сабрала сваю хатнюю бібліятэку абсалютна бясплатна. І гэта толькі яе частка...**

### АД ЧАРАПАХІ ДА ЗРУБА ХАТЫ

— Наша суполка «Аддам дарма» (vk.com/otdam_dam_darom) існуе ўжо два гады, — расказвае яе **адміністратар Анжаліка ГАНЧАРОВА**. — Хацелася проста стварыць групу, у якой можна было б публікаваць толькі сумленныя аб'явы, бо зараз вельмі шмат падманаў. То чалавек прапануе рэч дарма, а потым просіць за яе грошы, то бывае так, што і рэчы ніякай няма, а аб'ява — фікцыя. Навошта так рабіць, не ведаю, але факт застаецца фактам.

Сама час ад часу таксама нешта аддаю бясплатна: бо я такі ж чалавек, як і ўсе ўдзельнікі суполкі. Ёсць непатрэбная рэч — чаму б не прапанаваць яе таму, каму яна яшчэ спатрэбіцца?

Калі паглядзець, то сярод аб'яў такіх груп можна знайсці прапановы на любы густ. Вось маленькія чырванавухія чарапахі шукаюць новы дом, таму што ім не дае спакою гаспадарская кошка, а хамяка Толіка «ратуюць» ад вельмі актыўнага дзіцяці. А вось зусім новы — як сцвярджае аўтар аб'явы — пыласос, білеты на футбольны матч (якія зараз нікому не патрэбны, бо «кампанія не сабралася») і нават зруб хаты. Але больш за ўсё, канешне ж, адзення.


**Вось гэты пірог і стаў маёй першай спробай у фудшэрынгу.**

— Часцей за ўсё ў нашай суполцы аддаюць дзіцячае і жаночае адзенне, — расказвае Анжаліка. — Сярод удзельнікаў большасць складаюць жанчыны. Магчыма, мужчын гэта мала цікавіць. А калі ўжо больш дакладна, то вельмі шмат аб'яў пакідаюць мамы ў дэкрэце. Тут і касметыка па доглядзе для нованараджаных, і сумесі, і цацкі. Таксама даволі часта мы публікуем аб'явы, дзе аддаюць мэблю, бытавую тэхніку — часам у вельмі добрым стане, амаль новую. Аднак пры гэтым гаспадар можа прасіць аб самавывазе.

Сярод тых, хто аддае рэчы дарма, ёсць тыя, хто робіць гэта ўжо на працягу гадоў. І ні разу пра гэта не пашкадаваў. Бывае, што толькі так і атрымліваецца эканоміць, калі ў сям'і складваецца цяжкая фінансавая сітуацыя, а ўлазіць у даўгі зусім не хочацца.

— Дзесьці год-паўтара таму я выпадкова наткнулася на групу, дзе людзі пакідалі аб'явы аб тым, што аддаюць поўныя рэчы дарма, — расказвае **Кацярына ЕРМАЛОВІЧ**. — Вырашыла дзеля цікавасці напісаць жанчыне, якая прапаноўвала кажух (па шчаслівай выпадковасці — майго памеру) за кілаграм мандарынаў для дзяцей да Новага года. Так упершыню я штосьці забрала для сябе і праверыла, што такія аб'явы — праўда. Потым не раз забірала нейкія рэчы для сваіх дзяцей і была заўсёды ўдзячная людзям, бо ў мужа з'явіліся праблемы з выплатамі на рабоце, а прасіць грошай у сяброў ці ў сваякоў не хацелася.

Кацярына прызнаецца, што быў час, калі яна забірала рэчы не толькі для сабе, але і для іншых людзей:

— Бачыла — добрыя рэчы аддаюць, а на прыкмеце ёсць сям'я, якой бы гэта спатрэбілася. Бывала, для дзетак так збірала дапамогу ў дзіцячы дом.

Яшчэ адна карыстальніца сацыяльных сетак, **Анастасія ПРАХОЎНІК**, дзеліцца сваім удалым вопытам. Калі табе аддаюць рэч, а да яе — падарунак. Проста так, таму што «людзі добрыя»:

— Неяк я бясплатна забірала корм для рыбак. Прыехала па аб'яве, даю шакаладку, каб падзякаваць, а мне кажуць, што не трэба, ды яшчэ і кактус працягваюць у прыдачу — у якасці падарунка. А наогул, лічу, што калі рэчы ў добрым стане і яны табе ўжо не спатрэбяцца, то чаму б іх не аддаць. Магчыма, камусьці яны зараз больш неабходныя.

Аб тым, што падобныя аб'явы ў сацыяльных сетках — сапраўды добрая эканомія сродкаў, прызнаюць усе, хто мае ўдалы вопыт карыстання імі. Вось і **Аляксандра ГРАМЫКА**, якая не першы год «палюе» за бясплатнымі кнігамі, ужо сабрала вялікую хатнюю бібліятэку. «Кнігі хутка не будзе куды ставіць, прыйдзецца шукаць новую шафу», — усміхаецца яна.

— Канешне, кнігі — гэта не прадметы першай неабходнасці. Іх заўсёды ў большасці выпадкаў можна спампаваць з інтэрнэту. Але сама я не вельмі люблю чытаць з экрана. Таму і ганяюся за папяровымі кнігамі. А пакольні новыя выданні цяпер дарагія, эканомлю на тым, што людзі гатовыя аддаць бясплатна. Бо я малады спецыяліст і грошай, зразумела, у мяне не так многа.

Чаму кнігі аддаюць? Гэта ўжо іншае пытанне. Камусьці яны проста не патрэбныя: наводзяць дома парадак, знайшоў — выраашыў аддаць. Хтосьці пераязджае і не можа ўзяць з сабой усю хатнюю бібліятэку. Сітуацыі на самай справе бываюць розныя.

### АСЦЕРАГАЙЦЕСЯ МАХЛЯРОЎ

На жаль, нават у такой справе, як аддаць рэч дарма, можна натрапіць на ашуканцаў. Першая катэгорыя — тыя, хто пад кожнай аб'явай піша «забяру». Відавочна, што такіх асобаў у суполках ужо ведаюць — па той колькасці каментарыяў, якія яны пакідаюць у надзеі займець тую ці іншую рэч. Лагічна і тое, што чалавеку не можа быць патрэбна абсалютна ўсё: ад старых гузікаў да непрацуючага тэлевізара.

— Фізічна столькі не трэба чалавеку, — упэўнена Анжаліка Ганчарова. Куды ён гэта дзене — незразумела. Але тут ужо хутчэй пільнасць таго, хто аддае, адыгрывае важную ролю. Ці мець справу з такім чалавекам?

Другая катэгорыя — гэта тыя, хто забірае рэчы бясплатна, а потым перапрадае іх. Такая гісторыя адбылася з **Яўгеніяй АЛЯХНОВІЧ**, якая праз групу ў сацыяльнай сетцы аддавала туфлі:

— Усё было добра. З дзяўчынай, якая адгукнулася на маю аб'яву, мы сустрэліся. Якое ж было маё здзіўленне, калі праз тыдзень я ўбачыла ўжо ў іншай суполцы, як яна прадае туфлі, якія я ёй аддала. Мне стала непрыемна. Я пажадала ёй поспехаў у продажы і паспрабавала больш не ўспамінаць пра гэту сітуацыю.

### ЗАБЯРЫЦЕ ПЕЛЬМЕНІ, КАБ НЕ ПРАПАЛІ

Асобны від дабрачыннасці і яшчэ адна магчымасць аддаць тое, што табе больш не трэба, іншаму — фудшэрынг. Рух, які вельмі папулярны на Захадзе, пачаў актыўна развівацца і ў Беларусі. Фудшэрынг дазваляе дзяліцца ежай з іншымі людзьмі, каб яна не прападала.

У адной з суполак «Фудшэрынг. Аддам дарма ежу. Мінск» (vk.com/foodsharing_minsk), як высветлілася, можна аддаць дарма амаль усё: ад закаткаў і дамашніх пельменяў да экзатычнай гарбаты і непачатага торта. Так, уладальніца апошняга скардзіцца, што купіла пачастунак на рамантычную вячэру, а малады чалавек не прыехаў з камандзіроўкі.

**«Неяк я бясплатна забірала корм для рыбак. Прыехала па аб'яве, даю шакаладку, каб падзякаваць, а мне кажуць, што не трэба, ды яшчэ і кактус працягваюць у прыдачу — у якасці падарунка».**

Наогул, гісторыі аб'яў тут амаль падобныя: «села на дыету», «з'язджаю ў адпачынак», «прыходзілі госці», і працяг у іх таксама адзін — «засталося шмат ежы, аддам дарма».

Дарэчы, для карыстальнікаў адміністрацыя суполкі ўстанавіла наступныя правілы.

**Што можна аддаваць:** любыя прадукты харчавання добрай якасці, у тым ліку пачатыя ўпакоўкі або стравы ўласнага прыгатавання.

**Што нельга аддаваць:** сапсаваныя прадукты ці прадукты з першымі прыкметамі псавання; прадукты з даўно мінулым тэрмінам прыдатнасці (нават калі яны на выгляд засталіся такімі ж, як пры купілі); прадукты, свежасць якіх вызначыць немагчыма.

Акрамя гэтага, заўсёды неабходна ўказваць тэрмін прыдатнасці або дату вырабу прадукту.

**Ганна БАГІНО.** *bahino@zviazda.by.*

***P.S.** Я паспрабавала праверыць, як усё ж такі працуе фудшэрынг. Спякла пірог, размясціла аб'яву і стала чакаць... Ужо праз пару хвілін да мяне пасыпаліся першыя паведамленні з пытаннямі, ці актуальная яшчэ мая «смачная» прапанова. Думаць доўга не стала: вырашыла парадаваць дзяўчыну, якая напісала першай. Прыехала яна праз гадзіну. Трохі бянтэжачыся, прызналася, што пра фудшэрынг даведалася ад сяброўкі. Убачыла маю аб'яву — вырашыла напісаць. Проста так, асабліва ні на што не спадзеючыся.*

*Мы развіталіся з Марынай (так звалі маю госцю), але ўвесь дзень, нягледзячы на допіс, што аб'ява больш неактуальная, мне пісалі людзі з просьбай аддаць пірог. Асабліва павесяліў адзін каментарый. Мужчына пісаў: «А выходзьце за мяне замуж? Не прыйдзецца нікому пірагі аддаваць: я буду з'ядаць усё да апошняга кавалачка, абяцаю!»*

■

■ Зробім!

# Абаронім прыроду ад смецця... пад музыку

### ЭКАЛАГІ СТВАРЫЛІ КАРТУ БРУДНЫХ МЕСЦАЎ

**Некалькі гадоў таму я разам з сяброўкай удзельнічала ў сусветнай экалагічнай акцыі «Зробім!», якая ў нашай краіне ладзіцца вясной і восенню па выхадных. Мы разам з іншымі валанцёрамі (сярод якіх было шмат сем'яў з дзеткамі) ачысцілі ад смецця «адпачывальнікаў» біялагічны заказнік Сціклева. Вынеслі адтуль некалькі дзясяткаў вялізных мяшкоў! Падчас прыборкі-экскурсіі незвычайна цікавыя рэчы нам расказваў Аркадзь Скуратовіч з Інстытута эксперыментальнай батанікі! Сонца, сосны, свежае паветра, рэальная карысць, душэўная гарбата і цудоўныя людзі. Вось гэта выхадны!**

У кожнага з вас ёсць магчымасць таксама правесці выхадныя з карысцю. Так, 30 красавіка валанцёрскія акцыі па прыборцы лясоў, заказнікаў, берагоў вадаёмаў пройдуць па ўсёй краіне: у Брэсце, Магілёве, Пінску, Маладзечне, Скідзелі, Браславе і іншых гарадах і вёсках. Кропкі, у якіх запланаваныя добрыя справы, можна знайсці на сайце letsdoit.by.

— Каб далучыцца да прыборкі, трэба проста выбраць месца на карце ці ў анлайн-табліцы і прыйсці туды ў рабочым адзенні і з цудоўным настроем, — кажа **адна з арганізатараў акцыі «Зробім!» Хрысціна ЧАРНЯЎСКАЯ**. — Мяшкі для смецця і пальчаткі мы дадзім бясплатна.

Акцыі «Зробім!», як правіла, праходзяць у забаўляльным і адукацыйным фармаце. Напрыклад, у мінулую суботу ў Мінску ў яблыневым садзе па вуліцы Рафіева смецце прыбіралі пад музыку. А пасля пілі гарбату з прысмакамі і слухалі аповед бiёлага пра пладовыя дрэвы. Затым дырэктар кампаніі «Садовая калекцыя» Уладзімір Смольскі раздаў усім ахвотным саджанцы. І прапанаваў далучыцца да акцыі «Маё дрэва», зрабіць своеасаблівы падарунак зямлі — пасадзіць па яблыні. «Гэта будзе ваша дрэва, вы зможаце прыязджаць да яго, глядзець, як яно расце, даглядаць».

«Зробім!» — гэта частка сусветнага валанцёрскага руху «Let's Do It!», у які ўваходзіць 16 мільёнаў чалавек па ўсім свеце. Летась у Беларусі ў прыборках паўдзельнічала больш як 20 тысяч добраахвотнікаў з 53 населеных пунктаў. Далучайцеся і вы!

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

■


**Удзельнікі акцыі «Зробім!» у Магілёве**

# ТОЕ, ШТО ТРЭБА!

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

На жаль, спецыяльныя чахлы маюць толькі 10 працэнтаў радзільных дамоў. Астатнія выкарыстоўваюць коўдры, пялёнкі ці не накрываюць боксы зусім. Марына вырашыла, што некалькі рэанімацый яна зможа забяспечыць на дабрачыннай аснове. Патрэбны былі толькі грошы на расходны матэрыял. Тысячы долараў хапіла б на 60 накідак для дзесяці радзільных дамоў (па шэсць у кожны). Палову сродкаў рамесніца сабрала з дапамогай краўдфандынгу, палову — ахвяраваў мецэнат, якога ўдалося знайсці дзякуючы конкурсу сацыяльных праектаў Social Weekend.

Згодна з указам Прэзідэнта №300 ад 1 ліпеня 2005 года, займацца дабрачыннасцю можа любы чалавек. Але Марына для падстрахоўкі напісала яшчэ і ліст у Міністэрства аховы здароўя: там далі «зялёнае святло».

Распрацоўваць выкрайку прыйшлося самастойна. У інтэрнэце не няма, а адзіная беларуская фірма, якая некалі шыла накідкі па дзяржзаказе, пасля першай партыі спыніла іх вытворчасць.

— У выніку гатовы чахол на пару дзён пазычыў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Маці і дзіця», — успамінае Марына. — Разам з мамай — яна прафесійная швачка — мы ўночы рабілі выкрайку. Пасля я наведвала яшчэ радзільны дом №2 у Мінску. Там мне паказалі чахлы ў дзеянні, расказалі, якія плюсы ў розных відаў.

Накідка ад замежных вытворцаў каштуе каля тысячы еўра, сабекошт Марынінай — 15 еўра. Адкуль такая розніца? Па-першае, вядомыя кампаніі накручваюць цану з-за брэнда. Па-другое, чахлы прадаюць у камплекце з боксамі, якія каштуюць 15—20 тысяч еўра: у дадатак да гэтага тысяча ўжо не здаецца такой вялікай сумай. Па-трэцяе, замежныя вытворцы выкарыстоўваюць спецыяльную медыцынскую тканіну, а ў Марыніным варыянце — стапрацэнтная баваўна. Першая, вядома, больш трывалая, але яе нельга мыць пры высокіх тэмпературах, як гэта робяць з усёй бялізнай у бальніцах.

Калі рамесніца расказала пра свой праект у сацыяльных сетках, знайшліся жанчыны, гатовыя дапамагаць у вырабе чахлоў. «Але сутыкнулася з праблемай, што яны не ўмеюць шыць. Трэба спачатку арганізоўваць майстар-клас для іх: усё ж такі работа павінна быць якаснай. Таму ахвотным я даручаю пакуль распаўсюджваць інфармацыю. А з шыццём дапамагае мама. Такі сямейны праект», — усміхаецца Марына Бегункова.

**На жаль, спецыяльныя чахлы маюць толькі 10 працэнтаў радзільных дамоў. Астатнія выкарыстоўваюць коўдры, пялёнкі ці не накрываюць боксы зусім. Марына вырашыла, што некалькі рэанімацый яна зможа забяспечыць на дабрачыннай аснове.**




Для пашыву чахлоў спецыяльна выбіраліся яркія тканіны.

Фота Сяргея ЛЕСКІЧА.

Да яе цяпер часта прыходзяць лісты падтрымкі. А маладыя мамы дзеляцца сваімі гісторыямі. І просяць дапамогі. Так, Марыне нядаўна пісала жанчына з Санкт-Пецярбурга. Пыталася, ці прадаюцца чахлы. Аказалася, што яна беларуска, паехала з мужам адпачываць у Піцер і там нечакана нарадзіла раней за тэрмін. Дзіця выходжваюць у расійскай бальніцы, транспартаваць пакуль нельга, а накідак на боксы ў рэанімацыі не хапае. Некалькі штук рамесніца перадала ў тую бальніцу.

Партыю чахлоў завезлі ўжо і ў радзільню ў Маладзечна.

— Нашы вырабы цяпер чакаюць у рэгіёнах: у Бабруйску, Баранавічах, Магілёве. У адной радзільні расказвалі, што яны пакідалі заяўку на накідкі — ім два гады прывезці не могуць.

Праблемы на шляху таксама былі. У адной з бальніц, напрыклад, спачатку пагадзіліся прыняць чахлы, а потым, калі пачулі, што іх будзе толькі шэсць ды яшчэ прыедзе прэса (паведамляць пра далейшы лёс праекта важна, бо ён рэалізуецца за народныя грошы), сказалі, што не хочуць напружвацца...

У планах Марыны — працягваць шыць рэчы, неабходныя для неданошаных дзяцей. Ёсць папярэдняя дамоўленасць з адной баранавіцкай фабрыкай на бясплатную пастаўку тканіны для чахлоў. Акрамя гэтага, рамесніца збіраецца ствараць коканы-гнёзды (спецыяльныя матрацы, медыкі іх вельмі рэкамендуюць) і адзенне для нованароджаных.

— Хачу займацца сацыяльным прадпрымальніцтвам. 50 працэнтаў вырабаў шыць на заказ за грошы, 50 працэнтаў — аддаваць на дабрачыннасць, — дзеліцца Марына Бегункова. — Гэта складана: весці перамовы з радзільнямі, знаходзіць сродкі, сілы, цярпенне. Самае важнае для мяне — не «выгараць». Але ўсё роўна сацыяльнае прадпрымальніцтва — гэта цудоўна. Я ведаю, што многія ўдзячны за мой праект, і гэта мяне вельмі натхняе.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

### ДАВЕДКА

**За 2015 год у краіне з'явілася на свет пяць тысяч неданошаных немаўлят. За апошнія пяць гадоў працэнт неданошаных сярод усіх нованароджаных вагаецца ў межах чатырох працэнтаў.**

**Усяго ў Беларусі 110 радзільняў. У рэанімацыі звычайна стаіць 8—10 боксаў-кювезаў.**

### АФІЦЫЙНА

**Наталля СВІРЫДА, намеснік галоўнага ўрача па дзяцінстве і родадапамозе Маладзечанскай цэнтральнай раённай бальніцы:**

— На працягу года ў нашым радзільным доме выходжваецца ў сярэднім каля 45—50 неданошаных дзяцей. Гэта прыкладна 2,5 працэнта ад усіх нованароджаных. Стварэнне аптымальных умоў выходжвання з'яўляецца адной з найбольш важных задач арганізацыі дапамогі неданошаным дзецям у медыцынскіх установах. Адзін з фактараў, які спрыяе абароне немаўлят ад яркіх крыніц святла, гукавых раздражняльнікаў, — выкарыстанне чахлоў на інкубатары. Чахлы аснашчаны асобнымі «пялёсткамі», якія не абмяжоўваюць доступ для медыцынскіх маніпуляцый і дазваляюць праводзіць сеансы фотатэрапіі, рэнтгеналагічнае даследаванне і іншыя, не дастаючы дзіця з кювеза.

■ Эканомім разам

# «А да вас завітаў Паца-Ваца!», або Лямпы на варце кашалька

**Тыя, чыё дзяцінства прайшло ў 90-я гады, памятаюць забаўны ролік, які транслiраваўся доўгі час па тэлебачанні. Улюбёнец дзяцей, легендарны Паца-Ваца з планеты Альфамегацэнтаўра, заклікаў эканоміць электраэнергію, каб у бацькоў заставаліся грошы на цукеркі і марожанае. Хоць з тых часоў мінула два дзесяцігоддзі, але заклік застаўся важным і дагэтуль. На долю электрычнасці ў агульнай суме ў жыроўцы прыпадае прыкладна 15—20 працэнтаў. І чаму ж не заплаціць за яе меней, калі ёсць такая магчымасць? На ўласным прыкладзе пераканаўся: замененыя 5 гадоў таму лямпы ўжо доўгі час пакідаюць у нашай сямейнай кішэні штомесяц 4—5 рублёў. Зрэшты, аб усім па парадку.**



## ДАПАМОГ КРЫЗІС...

Да 2011 года наша сям'я карысталася выключна лямпамі напальвання. Цана на электрычнасць была невысокая (архіў на сайце Мінгарвыканкама падказвае, што 173 тагачасныя рублі), ртутныя энергазберагальныя лямпы каштавалі даволі дорага, а эпоха святлодыёдных свяцільнікаў толькі-толькі пачыналася. Усё змянілася ў ліпені 2012-га. Стала вядома, што кілават рэзка падаражэе з 238 да 295 рублёў. І да таго ж пайшлі чуткі, што нібыта ў краіне ўвядуць тры ступені аплаты за электрычнасць. Такім чынам пытанне, як сэканоміць, паўстала рубам.

Таму мы з татам адначасова замянілі тады 13 лямпаў магутнасцю 75 і 100 ват на энергазберагальныя 20-ватныя вытворчасці адной вядомай нямецкай фірмы. Цана пытання была не такая і малая. У тыя часы лямпа каштавала 40 тысяч рублёў за штуку. Так, можна было знайсці варыянты і танней, але не сакрэт, лямпы невядомых кітайскіх вытворцаў мелі і маюць адпаведную якасць. А як гаворыцца, мы не настолькі багатыя, каб купляць вельмі танныя рэчы.

Нашы разавыя выдаткі склалі 520 тысяч — ці 52 рублі па-сучаснаму. Кропка акупнасці для такой лямпы складала першапачаткова крыху больш за паўтары тысячы гадзін работы. Здавалася б, шмат. Але гэтая лічба рэзка зменшылася — ледзь не ўдвая. Паколькі імклівы рост тарыфаў на электрычнасць працягваўся (напрыклад, у жніўні 2013-га кілават каштаваў ужо не 295, а 504 рублі), а інвестыцыі ў новыя прыборы асвятлення ўжо былі зроблены, то менш чым за год пакупкі сябе апраўдалі. І пачалі прыносіць прыкметны прыбытак. Амаль за 5 гадоў карыстання ў нас згарэла толькі адна лямпа, ды і тое адбылося з-за частага ўключэння і выключэння. А спажыванне электрычнасці ўзімку ўпала са 180 кілават да 140—150.

Але цяпер варта задумацца пра набыццё ўжо святлодыёдных лямпачак. Тым больш што тэмп росту іх кошту за апошнія 7 гадоў куды меншы за падаражанне кілавата. Кропка іх акупнасці (калі замяніць 100-ватную лямпу напальвання коштам 80 капеек на аналагічную 13-ватную святлодыёдную брэндавага вытворцы па цане ў 9—10 рублёў) знаходзіцца ўжо ў межах 1000—1100 гадзін работы. Гэта максімальны паказчык пры ўмове, калі вы не выйдзеце за ліміт у 150 кілават, пасля якога расцэнкі за электрычнасць становяцца даражэйшымі прыкладна на траціну. І, канешне, калі ў вас дома стаіць газавая пліта.

Па цане святлодыёдныя лямпы не нашмат даражэйшыя за ртутныя энергазберагальныя (для якіх кропка акупнасці і ўвогуле складае прыкладна 900 гадзін з-за кошту прыкладна ў 7 рублёў і кошце кілавата ў 12 капеек), а вось плюсаў маюць шмат. Па-першае, яны не баяцца частага ўключэння і выключэння. Класічныя энергазберагальныя лямпы выходзяць са строю менавіта з гэтай прычыны. Менавіта таму іх не пажадана ставіць на кухні ці ў санвузле.

Яны маюць і больш эстэтычны выгляд. Колбы такіх лямпачак вельмі падобныя на звычайныя. У той час як ртутныя лямпы прадстаўлены ў выглядзе «макароны» ці некалькіх панэляў, сагнутых літарай П.

Да таго ж звычайную люмінесцэнтную лямпу проста так выкінуць нельга: вытворцы дабаўляюць у склад люмінафору пары ртуці. Гэту тэхналагічную асаблівасць абысці ніяк нельга. Святлодыёдныя лямпы такой хібы пазбаўлены.

## «ЛЯМПАЧКІ ІЛЬІЧА» СПІСВАЦЬ ЯШЧЭ РАНА

Напрыклад, у ванным пакоі або туалеце час іх работы не такі і вялікі. Так, канешне, можна набыць замест 60-ваткі 6-ватную святлодыёдную лямпу. Але ж параўнайце цэны: амаль 8 рублёў за святлодыёдную лямпу і 80 капеек за лямпу напальвання. Калі за 1 кілават электраэнергіі плаціць 11,92 капейкі, то атрымліваецца, што кропка бясстратнасці наступае толькі праз 1150 гадзін работы. Таму калі нават карыстацца той жа ваннай у сярэднім гадзіну на дзень, то вам спатрэбіцца больш за тры гады, каб выйсці «ў нуль». Але да гэтага часу гарантыя на святлодыёдную лямпу ўжо скончыцца. Таму ці варта скурка вычынкі — вырашаць вам.

Праўда, дарагія лямпачкі маюць усе шанцы акупіцца хутчэй. Не будзем забываць: плануецца, што ў 2018 годзе беларусы стануць аплачваць 100% камунальных выдаткаў. Значыць, зусім не выключана, што кілават можа падаражэць яшчэ...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*



# СЛІМАЧКІ, ХАМЯЧКІ ЦІ САБАЧКІ?

## ЯК ВЫБРАЦЬ СЯБРА ДЛЯ ДЗІЦЯЦІ І НЕ РАСЧАРАВАЦЦА

**— Тата, хачу сабачку! (Коціка, папугайчыка, чарапашку — патрэбнае падкрэсліць.)
Рана ці позна кожны з нас чуе ад дзіцяці гэтыя словы. І адмовіць бывае вельмі складана, і браць на сябе лішні клопат не хочацца. Таму даводзіцца шукаць кампраміс.
На сённяшнім пасяджэнні бацькоўскага клуба нашы таты разважаюць над плюсамі і мінусамі ўтрымання розных жывых істот, якія могуць жыць побач з намі.**

### Каб не стала шчаня ваўкарэзам

**Валянцін Бойка:** — Хатняя жывёла патрэбная, асабліва калі дзіця ў сям'і адно, а другога пакуль не прадбачыцца. Мой малы таксама хоча сабе чатырохногага сябра, але пытанне пакуль завісла: думаем, каго лепей узяць.

**Сяргей Куркач:** — Вось тут трэба вельмі добра падумаць, і прыслухоўвацца не толькі да дзіцяці, але і да свайго жыццёвага досведу. Некалі мае малыя аж пішчалі — так хацелі сабаку. Жонка ўзяла ў знаёмых маленечкае белае шчаня. Першыя тыдні яно ціха спала ў скрыначцы, і мы назвалі яго Соня. І ўсе захапляліся: сабачка дробненькі, зусім не брэша, есць мала. Хоць асабіста мяне збянтэжылі непрапарцыянальна вялікія лапкі. І сапраўды: праз паўгода шчаня вырасла ў саракакілаграмовага сабаку — помесь амерыканскага бульдога з кімсьці яшчэ.

У выніку сабака гуляў з усімі, але хадзіць на вуліцу мог толькі са мной. Дванаццацігадовая дачка ўжо не магла даць рады: Соня проста вырывала павадок. А яшчэ па ўсёй хаце была поўсць. І ці не цераз дзень мы пыласосілі кватэру. А самога сабаку раз на тыдзень трэба было мыць, бо інакш ад яго пачынала кепска пахнуць. Карацей, лёгка і проста было, пакуль сабачка быў маленькі. З ім гулялі, цешыліся ўсе. Але як толькі вырасла гэткая аграмадзіна, жыцця ў хаце не стала. Хоць сабака і застаўся мілым ды ласкавым.

**В.Б.:** — Дзеці часта пераацэньваюць свае сілы. Ім шчыра здаецца, што яны змогуць паўнавартасна даглядаць жывёліну. І таму я не спяшаюся дазваляць сыну завесці некага большага за хамяка. Калі я быў малым, у майго бацькі быў шатландскі сэтар — вялізны, але міралюбны і дабрадушны сабака. І ўжо тады я бачыў, колькі гэта клопату — трымаць такую жывёліну. А ў вялікім горадзе з яго шчыльнай забудовай сабаку нават выгуляць цяжка. Даводзіцца або далёка ісці, або парушаць правілы і вадзіць яго на газон.

**С.К.:** — Я свайго сабаку на газон не вадзіў, бо суседзі б не зразумелі гумару. Каб выгуляць Соню, даводзілася ісці на пустку за кіламетр ад дома. Дый нават туды я браў з сабой пакецік і шуфлік, каб прыбраць наступствы прагулкі. І займаў шпацыр з сабакам не менш за гадзіну, прычым хадзіць даводзілася ў любое надвор'е. Таму і адправілі Соню да маіх бацькоў, што жывуць у прыватным доме ў невялікім райцэнтры. Там з гэтым прасцей.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**В.Б.:** — А яшчэ ёсць суседзі, якія бачаць у вялікім сабаку не мілую істоту, а патэнцыйную небяспеку. І паспрабуйце растлумачыць ім, што ваша жывёла людзьмі не харчуецца. Памятаю, бацькаў сэтар кідаўся да ўсіх стрэчных, каб пагуляць, а народ шугаўся. Таму я лічу, што трымаць у горадзе некага вялікага ўвогуле не варта, калі ты жывеш у звычайнай кватэры. Максімум, на што я згодны, дык гэта на кошку.

**С.К.:** — З кошкамі таксама ёсць свой клопат. Калі бярэш сабе кацяня, трэба ў належны час адвезці яго да ветэрынара на стэрылізацыю. Бо пасля каты пачынаюць меціць тэрыторыю, і «апрацаваную» кватэру ўжо ніколі не праветрыш дарэшты. Адзіны паратунак — капітальны рамонт.

**В.Б.:** — Выходзіць, куды ні кінь — усюды клін. Якую жывёлу ні возьмеш — безліч праблем. Але ж дзецям трэба кантактаваць з жывёламі, кагосьці даглядаць. Вось у вёсцы малыя ходзяць карміць курэй, трусоў, свінак. І яны ў абыходжанні з жывёламі больш смелыя і гуманныя. А што рабіць гарадскому дзіцяці? Дзе выйсце?

**С.К.:** — Малым сапраўды трэба кагосьці даглядаць, ім патрэбны сябар. Хай нават маўклівы. Але ёсць жывёлы, з якімі значна прасцей. Некалі мне падарылі двух сухапутных слімачкоў памерам з пацерку. А пасля яны выраслі вялікія: адна толькі ракавіна — з далонь. Але яны спакойна жывуць у акварыуме, які нам дастаўся выпадкова і бясплатна. А ён абавязкова патрэбны: слімакі хоць і марудлівыя, але распаўзаюцца так, што пасля не знойдзеш. Што да ежы, то яны непераборлівыя: харчуюцца лісцем трыпутніку і дзьмухаўца. Дужа любяць агуркі. Прычым даўжэзныя раннія з крамы, вырашчаныя невядома на чым, не ядуць. А як яны жуюць — гэта вельмі цікава паглядзець: у іх каля трох тысяч драбнюткіх зубоў. Але прыбіраць за імі таксама трэба. І раз на тры дні мыць акварыум. Трэба сказаць, што дзецям яны хутка надакучылі.

**В.Б.:** — У нас таксама былі слімакі, толькі вадзяныя і зусім маленькія: дзядуля адсадзіў са свайго акварыума, бо малы вельмі папрасіў. Жылі яны ў слоіку з вадой, якую трэба было рэгулярна мяняць. Сын абяцаў, што будзе рабіць гэта сам, але забываўся. У выніку вада застаялася, пакрылася плёнкай — і слімакі задыхнуліся. І калі малы хацеў набраць у дзядулі новых, я не дазволіў: «Адных ты ўжо замарыў, годзе здзекавацца з жывёл». Сын, канешне, пакрыўдзіўся. Але я лічу, што гэта карысны для яго ўрок.

### Сварыцца забараняецца

**С.К.:** — Усё-ткі малым патрэбныя жывёлы больш рухавыя, цеплакроўныя, але кампактныя. Мая сярэдняя дачка неяк дужа захацела хамячка. І яна сама вывучыла ўсю даступную літаратуру, сама знайшла ў інтэрнэце, у каго можна купіць жывёлінку. Я толькі купіў на рынку невялічкую клетку. У астатнім даглядала яна сама: купляла проса, семачкі, сама перамешвала і рабіла корм. А таксама набывала апілкі, мяняла іх. Нават размаўляла з хамяком.

І выйшла так, што не столькі яна выхоўвае хамячка (гэта было б складана), а хамяк яе. Бо мая дачка — дзяўчынка эмацыянальная: раней яна часта павышала голас ажно да віску, калі ёй нешта не падабалася. Тады мы з жонкай растлумачылі ёй, што такая гукавая атака больш б'е па хамяку, чым па нас. Пасля гэтага дачку як падмянілі: цяпер яна і сама не павышае голас, і дарослых прымушае размаўляць спакойна, калі мы спрабуем сварыцца.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Спадар КУРКАЧ гатовы цалавацца нават са слімакамі.

**В.Б.:** — Хамяк — гэта цудоўна: займае мала месца, мала есць, не трэба дарагіх аксесуараў. Але трэба ўлічваць, што гэта жывёла пераважна начная. Наш хамяк апоўначы залазіў у сваё кола і пачынаў яго апантана круціць. І ў цішыні яно гудзела даволі гучна. Таму хамяка на ноч даводзілася выстаўляць у кухню і зачыняць дзверы, бо спаць не даваў.

**С.К.:** — Калі хочаш цішыні — то завядзі рыбак. Яны ўвогуле ўвесь час маўчаць, як і мае слімакі. І з акварыума нікуды не дзенуцца.

**В.Б.:** — Рыбкі калісьці ў мяне былі. Гэта толькі здаецца, што яны не патрабуюць клопату. Насамрэч рыбкам таксама патрэбны разнастайны корм, яны таксама могуць хварэць. А для падтрымання іх жыццядзейнасці, акрамя акварыума, трэба багата розных прылад. Дый сам акварыум трэба перыядычна чысціць, час ад часу мяняць у ім ваду. Таму рыбкі — гэта варыянт для тых, хто ўжо прайшоў пэўную «школу» ўтрымання хатніх жывёл. І перш чым іх завесці, добра падумайце: ці сапраўды гэта тое, што вам трэба.

### Жыві доўга, хамячок!

**С.К.:** — Калі выбіраеш хатнюю жывёлу для маленькага дзіцяці, лепей каб гэта была істота з досыць працяглым жыццём. Напрыклад, мае слімакі — гіганцкія ахаціны — жывуць да дзесяці гадоў. А вось хамяк звычайна два-тры. І для маленькага дзіцяці гэта вялікая псіхалагічная траўма, калі ўлюбёнец хутка памірае. Затое ў дзесяць-дванаццаць гадоў дзеці ўжо спакайней успрымаюць гэты факт.

**В.Б.:** — Тут цікавая асаблівасць: чым бліжэйшая да нас жывёла біялагічна, тым больш смутку выклікае яе смерць. Таму дзеці так бядуюць па сваіх хамячках. А калі памірае сабачка — дык гэта проста драма. Бо ён па інтэлекце значна бліжэй да нас, чым хамяк.

**С.К.:** — Вось з гэтай прычыны я б не раіў бы браць ужо дарослага сабаку ці ката ў гадах. Бо ў вашай сям'і яны пражывуць нядоўга.

**В.Б.:** — У рыбак у гэтым сэнсе ёсць вялікая перавага: у акварыуме іх звычайна багата — адной болей, адной меней... Увогуле халаднакроўныя жывёлы ў гэтым сэнсе неблагі варыянт. З імі цікава, але да іх не надта прывязваешся эмацыянальна.

**С.К.:** — Магчыма, гэта таксама варыянт. Але не трэба надта паддавацца модзе і цягнуць дахаты розную экзотыку, пра якую мы нічога толкам і не ведаем: яшчарак, чарапах, змей, трытонаў, жабак. Не стаў бы я эксперыментаваць таксама з насякомымі і членістаногімі. Бо ёсць аматары завесці ў сябе мадагаскарскіх тараканаў або павукоў-птушкаедаў. Гэта чыста дарослая забаўка.

**«Вада застаялася, пакрылася плёнкай — і слімакі задыхнуліся. І калі малы хацеў набраць у дзядулі новых, я не дазволіў: «Адных ты ўжо замарыў, годзе здзекавацца з жывёл».**

### Дарослая забаўкі або дзіцячая бяспека?

**В.Б.:** — Некаторыя з экзатычных істот балюча кусаюцца і нават могуць аказацца атрутнымі. Увогуле бяспека — гэта першае, пра што мусяць падумаць бацькі, калі выбіраюць хатнюю жывёлу.

**С.К.:** — Небяспечным можа быць не толькі экзатычны тарантул, але і звычайны сабака. Свайго мы адправілі да маіх бацькоў адразу пасля таго, як у нас нарадзілася трэцяе дзіця. Бо якім бы дабрадушным ні быў той сабачка, але гэта звер. А немаўля можа ненаўмысна яго раззлаваць. Таму жывёлу трэба выбіраць не сэрцам, а розумам.

**В.Б.:** — Цікава, а чым вы выбіралі сваіх слімакоў? Мне здаецца, што ўсё-ткі сэрцам. Самі неяк расказвалі, што ўначы правяраеце, як яны маюцца, ці хапае ім харчу. Напэўна, размаўляеце з імі. Цікава, можа, яны вам нават нешта адказваюць? Нездарма кажуць, што мы любім тых жывёл, якія чымсьці нагадваюць нас саміх. А што ў вас агульнага са слімакамі?

**С.К.:** — Гэта табе збоку лепей відаць, што ў нас агульнага. А я іх проста люблю. Калі я іх мыю пад кранам, яны ад асалоды аж папіскваюць. І мой голас пазнаюць, калі да іх звяртаюся. Гэта табе здаецца, што яны неразумныя. Проста яны ўмеюць маўчаць. (Не тое, што мая жонка)

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*
**Валянцін БОЙКА.**

# НАЙЛЕПШЫ ПАДАРУНАК — ГЭТА ЧАС



Ганна ШАПАШНІКАВА і Леанід ПАЎЛЁНАК з дачушкай Евай.

## «АМАЛЬ УВЕСЬ ГАНАРАР ТРАЦІМ НА КНІГІ»

***— Вы выбралі для сустрэчы не зусім звычайнае месца — кнігарню-кавярню «Сон Гогаля». Я так разумею, кнігі займаюць важнае месца ў вашым жыцці?***

**Ганна:** Мы жывём у розных дамах.

**Злата:** І ў кожнай з нас свае кніжныя паліцы на ўсю сцяну.

**Ганна:** Хоць кнігамі мы часта мяняемся. Адштурхоўваемся ад прачытанага, і ў нас з'яўляюцца новыя песні, спектаклі, цікавыя мерапрыемствы. Бо кнігі — гэта крыніца натхнення.

**Злата:** Калі мы з Аняй вяртаемся з гастроляў — як правіла, прывозім поўныя чамаданы кніг. У кнігарнях бываем часцей, чым у крамах адзення. Так здараецца, што практычна ўвесь ганарар сыходзіць на кнігі.

**Ганна:** Лічу, што гэта вельмі разумнае ўкладанне грошай.

***— Хто вас натхніў на стварэнне такога новага для нашай краіны кірунку, як бэбі-тэатр?***

**Ганна:** З'яўленне ўласных дзяцей. Усё пачыналася з дамашніх тэатраў. Мы паказвалі спектаклі сваім дочкам, сябрам, у якіх ёсць маленькія дзеці. Калі пачалі паглыбляцца ў тэму, даведаліся пра італьянца Раберта Фрабэці. Ён ужо 30 гадоў прыдумляе спектаклі для гледачоў ад годзіка да трох. Нам са Златай пашанцавала вучыцца ў яго. Спасылку на навучанне ў «Бэбі-лаб» (тэатральная лабараторыя ў Маскве для акцёраў і рэжысёраў, якія хочуць працаваць з маленькімі гледачамі) мне даслала сяброўка. І мы са Златай, не раздумваючы, падалі заяўку. Вучымся там ужо 3 гады...

**Злата:** І плануем працягваць. Некаторыя думаюць, што тэатр для самых маленькіх немагчымы. Маўляў, у такім узросце нерэальна надоўга ўтрымаць увагу дзіцяці. Мы ж даказваем адваротнае. Нашы 30-хвілінныя спектаклі з задавальненнем глядзяць нават гадавасікі. Усё магчыма, проста трэба адчуваць дзяцей, прыслухоўвацца да іх.

***— Чым бэбі-тэатр адрозніваецца ад звычайнага?***

**Ганна:** Сцэна тут знаходзіцца на адлегласці выцягнутай рукі. Каб артысты маглі падтрымліваць візуальны кантакт з кожным гледачом.

**Злата:** Нашы гледачы сядзяць не ў крэслах, а побач з мамамі на падушачках, на ўзроўні падлогі. Бо ў малечы ёсць фізічная патрэба мяняць становішча цела кожныя 2—3 хвіліны. І адчуваць стук мамінага сэрца.

**Ганна:** Яшчэ наш тэатр можна назваць вельмі далікатным. Тут няма таго, што нечакана можа напужаць: выключанага святла (гэта адзін з асноўных момантаў, чаму пачынаюць плакаць маленькія дзеці ў тэатры), рэзкіх гучных гукаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## «ЦУД МОЖНА СТВАРЫЦЬ СА ЗВЫЧАЙНЫХ РЭЧАЎ»

***— А што вас зблізіла, акрамя любові да кніг і тэатра? Як вы наогул знайшлі адна адну?***

**Злата:** З Аняй мы пазнаёміліся спачатку завочна. Я была ў захапленні ад яе крамы «Шарсцяная шафа». І ад майстэрні, дзе яна вучыла іншых рабіць цацкі з воўны. Там было ўсё супер-пупер афармлена: усялякія галінкі, казачныя дрэвы... А я ў гэты час таксама займалася рамесніцтвам, рабіла лялек. Ездзіла па кірмашах. Перад чарговым прапанавала Ані арэндаваць адно месца на дваіх. Там ужо была магчымасць пазнаёміцца бліжэй.

**Ганна:** Сёння нашаму сумеснаму тэатру ажно 4 гады. Нават не верыцца. Многія думаюць, што мы сёстры. Відаць, з часам сталі падобныя нават знешне: мімічныя рэакцыі пераймаем, насы яшчэ больш кірпатыя становяцца. Што нас яшчэ аб'ядноўвае, акрамя агульных інтарэсаў? У Златы, як і ў мяне, вельмі творчы муж.

**Злата:** Гэта асобы тып сям'і, дзе муж з'яўляецца творчым чалавекам на 150—200%. І Вова, і Лёня не толькі ўдзельнічаюць у нашых спектаклях, але і, калі трэба, па начах дапамагаюць з дэкарацыямі (муж Ані — Леанід Паўлёнак іграе ў музычным гурце «Нагуаль», муж Златы — Уладзімір Глотаў — акцёр драматычнага тэатра імя Горкага).

***— Наколькі для вас важная падтрымка мужа?***

**Ганна:** Асабіста для мяне вельмі важная.

**Злата:** І для мяне. Прычым важна ўсё: парады, дапамога, удзел, ацэнка. Калі ён праз нейкі час кажа: «Ведаеш, а вось там можна было зрабіць вось так», значыць, гэта ў яго засталося, жыве ўнутры. «Пацеркі» таксама яго цікавяць, не менш, чым асноўная работа. І нашы дзеці, якія ва ўсім гэтым «варацца», бачаць, што мама цікавіцца работай мужа, і наадварот. Што яны робяць нешта разам, што яны дзесьці не згодныя, а пасля прыходзяць да кансэнсусу. Чаго ў нас няма, ні ў сем'ях, ні ў «Пацерках», — дык гэта абыякавасці. Праўда, Аня?

**Ганна:** І мне гэта вельмі падабаецца.

***— Ваш тэатр — выратаванне для мам, якія знаходзяцца ў дэкрэце. Я пару месяцаў таму хадзіла ў філармонію на Брандэнбургскія канцэрты Баха. Дык дзяўчыну са слінгам не пусцілі ў залу, нягледзячы на набыты квіток. Сказалі, што з дзецьмі да трох гадоў наведваць вячэрнія канцэрты нельга.***

**Злата:** Баха, можа, яны ў нас і не пачуюць. Але ў бэбі-тэатры мы стараемся выкарыстоўваць выключна жывую музыку.

**Ганна:** Узаемадзеянне дзіцячай душы і жывой музыкі — гэта сапраўднае чараўніцтва. Малеча адразу ж рэагуе на вібрацыю скрыпкі, стук барабана, бо такія гукі ў штодзённым жыцці яна чуе вельмі рэдка.


Сям'я ГЛОТАВЫХ.

**Злата:** Бэбі-тэатр — гэта магчымасць для малечы даведацца штосьці новае пра свет.

***— А дачок водзіце на свае спектаклі?***

**Ганна:** Нашы дзеці прысутнічаюць на рэпетыцыях і абмеркаваннях. І глядзяць спектаклі шмат разоў. Псіхалагічна даказана, што паўтарэнне для дзіцяці маленькага ўзросту вельмі карыснае.

**Злата:** Мая старэйшая дачка з гледача паступова ператвараецца ў крытыка. Цікава, што адзін і той жа спектакль выклікае ў яе розныя адчуванні. Ад «Ах, як было цудоўна!» да «А можа, вам варта было б зрабіць вось так». Для нас гэта меркаванне вельмі карыснае.

**Ганна:** Дарэчы, старэйшая дачка Златы летась намалявала лялек-герояў для нашага беларускамоўнага спектакля «Стойкі алавяны салдацік».

**Злата:** Малюнкі Ясны мне вельмі спадабаліся, было цудоўна працаваць з імі.

***— Практычна ў кожным вашым спектаклі ёсць частка з майстар-класам. Падчас якога дзеткі пры дапамозе бацькоў ствараюць нешта сваімі рукамі.***

**Ганна:** Такім чынам мы хочам натхніць бацькоў, каб яны і дома працягвалі гуляць са сваімі сыночкамі-дочкамі.

**Злата:** Дзеці гуляюць штодзень, але задача бацькоў зрабіць так, каб гэта гульня была напоўнена сэнсам. Усе хлопчыкі і дзяўчынкі ўмеюць прыдумваць, але не заўсёды выкарыстоўваюць гэты навык. Бо, як правіла, атрымліваюць яркія цацкі, якія самі рухаюцца, самі спяваюць. І нікога не трэба расфарбоўваць, агучваць, нічога не трэба рабіць — толькі сядзець і глядзець.

**Ганна:** А вельмі важна, каб дзіця бачыла, што штосьці цікавае можна стварыць нават са звычайных рэчаў: з каменя, з кавалка тканіны... Як у нас у спектаклі «Птушка. Цягнік. Патэфон», швейная машынка раптам ажывае і пачынае махаць крыламі, разганяецца хуткім цягніком і скрыпець старым патэфонам. Маміны тканіны ператвараюцца ў горы і рэкі, маленькія катушкі пачынаюць стукаць, быццам барабанчыкі...

**Злата:** Раю бацькам не гнацца за цацкамі з тэлевізара. Бярыце звычайныя лыжкі, талеркі і ладзьце на кухні канцэрты. Стукайце, звініце, пералівайце ваду. Вельмі хачу зрабіць у рамках «Пацерак» курс «Тэатр з мамай». Паказаць, як праз гульню, тэатр і кнігі можна расшыраць фантазію дзіцяці. А пакуль будзем гэта рабіць у сямейных летніках.

***— Мае сябры ездзілі летась у тэатральна-музычны сямейны летнік, які вы ладзілі ў Белавежскай пушчы. Засталіся ў захапленні.***

**Ганна:** Вельмі іх разумею. Некалькі гадоў таму я сама наведала падобны сямейны летнік у Славакіі. Там была вельмі творчая атмасфера! І мне захацелася зрабіць штосьці падобнае для беларускіх сем'яў. Сямейныя летнікі — гэта асобы від адпачынку. Дзе дзеці могуць убачыць сваіх бацькоў зусім з іншага боку. Часта чуем ад мам і татаў: «я ўжо і не памятаю, калі я...», «я ніколі не думаў, што ў мяне атрымаецца». Як у любым творчым працэсе адбываецца вельмі шмат адкрыццяў. У тым ліку ў бацькоў датычна саміх сябе. Са з'яўленнем дзяцей важна не страціць сябе, не здрадзіць сваім інтарэсам. Сямейны летнік — гэта, па сутнасці, сюрпрыз для бацькоў і іх дзетак. Для мяне ж гэта магчымасць рэалізаваць свае самыя вар'яцкія ідэі.

**Злата:** У мяне зусім іншая гісторыя. Я ў летніках прапрацавала з 16 да 26 гадоў. І заўсёды была важатай старшых атрадаў. Калі Аня вярнулася са Славакіі і прапанавала разам зладзіць сямейны летнік, я падумала: «Гэта не для мяне. Што там з малечай рабіць?» Але трапіла туды аднойчы і заразілася гэтай ідэяй. Адзін старэйшы сябар сказаў мне, што любіць дзіця — гэта праводзіць з ім разам час. Думка мне спадабалася. І менавіта сямейны летнік заняў адну з самых рэйтынгавых пазіцый па якасці праведзенага часу, радасці ад яго. Гэта як прагулка з сям'ёй у лес, але не на гадзіну, а на цэлых 10 дзён.

*Ганна пабегла на спектакль. А мы са Златай паспелі яшчэ пагаварыць пра мары і пра тое, як стаць для сваіх дзяцей сябрам...*

## «ДОМ — ГЭТА МЕСЦА, ДЗЕ ТЫ ПАВІНЕН ПАМЫЛЯЦЦА»

***— Нядаўна знаёмая напісала: «Калісьці я думала, што сям'я — гэта нуда. Цяпер ведаю, што ад мяне штосьці ўтойвалі: сям'я — гэта найлепшае месца на зямлі».***

— Для мяне сям'я — гэта што заўгодна, але толькі не нуда. На нуду ў нас проста часу няма. Сям'я для мяне была і застаецца цудоўнай магчымасцю. Магчымасцю жыць з каханым чалавекам, паставіць у кватэры ўсё, як ты хочаш, падарожнічаць разам. На наступны дзень пасля вяселля мы з мужам з'ехалі працаваць вулічнымі артыстамі ў Францыю. У нас было такое вясельнае падарожжа. Яно працягваецца і дагэтуль. І дзеці таксама былі магчымасцю стаць кімсьці новым, падзяліцца сваім вопытам. Мы, напрыклад, не глядзім тэлевізар. Бо разумеем, што дочкі не будуць успамінаць свой найлепшы дзень прагляду перадачы. Таму займаем вольны час адно адным. У нас няма вялізнай перагрузкі па гуртках, мы не бегаем па развіваючых секцыях. Калі напачатку мне здавалася, што гэта вельмі важна, то цяпер зразумела, што ўсяму свой час. Мы любім разам штосьці майстраваць з кардону. А таксама глядзець мюзіклы. Зараз Ясне толькі 8 гадоў, але яна настолькі шмат ведае песень адтуль. Мне здаецца, што гэта ўжо будзе бясцэнным багажом, нават калі яна потым зацікавіцца касмасам. Яшчэ мы фанаты настольных гульняў. Гэта адзін з самых карысных інтарэсаў, на мой погляд.

***— На пачатку размовы вы сказалі, што збіраеце кнігі пра падлеткаў. Як застацца для сваіх дзяцей сябрам, калі яны вырастуць?***

— Я не ведаю дакладнага адказу. А цікаўлюся літаратурай пра падлеткаў, каб самой зразумець, што рабіць праз пару гадоў. Мы нядаўна з Аняй разважалі на гэтую тэму, бо збіраемся рабіць спектакль пра дом. Я зразумела, што для мяне дом — месца, дзе ты павінен мець магчымасць памыляцца. Гэта абсалютная зона даверу, дзе разбіты кубак не стане прычынай пакарання. Дома ты ў бяспецы. Таму менавіта тут, дзе цябе прымаюць такім, які ты ёсць, варта ўсё паспрабаваць і пацярпець няўдачу. Напэўна, мне гэта хацелася самой адчуваць у дзяцінстве, таму цяпер дома мы дзелімся не толькі радасцямі і дасягненнямі, але і сваімі страхамі, падтрымліваем адно аднаго. Я думаю, што ўся справа ў даверы. Калі ён ёсць у дзяцінстве, то нікуды не знікне і потым. Спадзяюся, менавіта гэта калісьці і павінна спрацаваць.

***— Вы вучыце дзяцей фантазіраваць, марыць. А пра што марыце самі?***

— Маем з Аняй адну мару на дваіх. Мы вельмі хочам, каб у нас з'явілася сваё памяшканне для тэатра. Гэта будзе цудоўнае творчае месца для дзетак і іх бацькоў. У нас шмат ідэй. Але калі пачынаеш прыдумляць новы спектакль, першая думка: як ты яго перавязеш, колькі хвілін ты яго будзеш манціраваць. Машына, у якую павінны змясціцца ўсе дэкарацыі, — гэта і ёсць абмежавальнік нашай фантазіі. Калі з'явіцца свой дом, мы зможам зрабіць тое, пра што цяпер толькі марым. І нават больш.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

УНП 100262226

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
14.04.2017 г.
Лихачевским В.В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об эмиссии облигаций Общества с ограниченной ответственностью«ЛОДЭ» второго выпуска

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента**

На русском языке:

полное – Общество с ограниченной ответственностью «ЛОДЭ» (далее – Эмитент);

сокращенное – ООО «ЛОДЭ».

На белорусском языке:

полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЛОДЭ»;

сокращенное – ТАА «ЛОДЭ».

**2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail), официальный сайт**

Республика Беларусь, 220005, г. Минск, ул. Гикало, д. 1, пом. 10, тел./факс 80172846919, e-mail: secret@lode.by, официальный сайт: www.lode.by. (далее – сайт Эмитента)

**3. Основные виды деятельности**

специализированная врачебная практика;

стоматологическая деятельность

**4. Номера расчетного и (или) валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование банка**

Денежные средства, поступающие при размещении облигаций Эмитента второго выпуска, будут зачисляться в соответствии с законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на расчетный счет Эмитента №3012150214023 (в долларах США) в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №700 по г. Минску и Минской области, код 369.

**5. Раскрытие информации эмитентом**

Эмитент в случаях и порядке, установленных законодательством Республики Беларусь, раскрывает информацию на рынке ценных бумаг:

путем ее размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее – Единый информационный ресурс);

а также путем ее опубликования в газете «Звязда» и (или) размещения на сайте Эмитента, указанном в пункте 2 настоящего документа;

либо путем ее доведения до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным законодательством Республики Беларусь, а также путем ее представления в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь, определенному кругу лиц.

5.1. Эмитент раскрывает информацию о своей реорганизации, а также о реорганизации своих дочерних и зависимых хозяйственных обществ (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на Едином информационном ресурсе.

Информация о реорганизации раскрывается не позднее 2 (двух) рабочих дней:

с даты принятия соответствующего решения общим собранием участников Эмитента;

с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; даты внесения в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности присоединенной организации.

